ЯКАЯ БУДУЧЫНЯ Ў «СЛУЖБОВЫХ РАМАНАЎ» 5

ПАДЛЕТКАВЫ НАРКОЛАГ ПРА ЗАЛЕЖНАСЦЬ 6

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

10 ВЕРАСНЯ 2020 г. ЧАЦВЕР № 176 (29290)

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі:

«Недапушчальна, каб лёс Беларусі станавіўся закладнікам чыіхсьці амбіцый і карыслівых памкненняў. Сёння ад усіх палітычных сілаў і грамадскіх структур патрабуецца агульная адказнасць. Шмат у чым галоўнае значэнне набывае маладзёжная палітыка. Асабліва ў рэалізацыі перспектыўных эканамічных, сацыяльных, адукацыйных, навуковых, культурных і іншых праектаў і праграм. У гэтым сэнсе ў працавітых, адукаваных, разумных маладых людзях, адказных грамадзянах Беларусі мы маем вельмі значны грамадскі і дзяржаўны рэсурс. Выкарыстоўваць яго каласальныя магчымасці можна толькі на хвалі пазітыўнага настрою. Трэба дакладна ведаць запыты ў розных сегментах маладзёжнага асяроддзя ў кантэксце запытаў грамадства і адпаведна адказваць на іх».

Народны лекар

Покрашаўскі фельчар каля свайго старэнькага ФАПа.

Семдзесят гадоў у адным населеным пункце — у вёсцы Покрашава Слуцкага раёна, у адным і тым жа будынку (даваенным), у адным кабінеце, а галоўнае, на адной пасадзе, а менавіта — фельчарам працуе найстарэйшы жыхар вёскі Сяргей ШКЛЯРЭЎСКІ. Ці магчыма такое ў наш час? Сёлета Сяргею Іванавічу «стукнула» дзевяноста два гады. Можна без перабольшвання сказаць, што медык не проста працуе, а аддана служыць сваёй дакладна абранай прафесіі, свайму прызванню, і, вядома, сваім аднавяскоўцам і землякам. Шклярэўскі паказаў і паказвае, што такое характар і стыль жыцця вясковага лекара — сапраўднага, народнага. Паверце, такія прыклады сярод вясковых медыкаў яшчэ трэба пашукаць! Радзіма ацаніла шчырую працу фельчара, прысвоіўшы яму ў свой час званне Героя Сацыялістычнай Працы.

— Не ўяўляю сябе без справы і пакуль адчуваю ў сабе здароўе і цікавасць да жыцця з задавальненнем выконваю свае працоўныя абавязкі — праводжу прыёмы ды лячу хворых, гляджу немаўлят і старэйшых дзяцей, у ранейшыя часы сам і роды прымаў, — прыгадвае Сяргей Іванавіч.

Калі малады фельчар уладкаваўся на покрашаўскі ўрачэбны ўчастак (а гэта было ў далёкім 1949-м), ён абслугоўваў шмат вёсак, сярод якіх была і мая малая радзіма — вёска Вынісцы. І, калі я нарадзіўся, першым педыятрам у маім жыцці быў менавіта Сяргей Шклярэўскі.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

КАРАТКА

• Дзяржзаказ па збожжы ў Беларусі выкананы больш чым на 95 %.

• Конкурс па праграмаванні пройдзе ў БДУ. Змаганне арганізуюць анлайн з 14 да 19 верасня.

• Ірландскі інвестар плануе пабудаваць фотаэлектрычныя станцыі ў СЭЗ «Віцебск».

• Дзмітрый Баскаў абраны старшынёй Федэрацыі хакея Беларусі.

• Звыш $ 118 млн інвестыцый паступіла ў І паўгоддзі ў СЭЗ «Мінск» з-за мяжы.

Сезон

ЯКАСНАЯ ПРАДУКЦЫЯ ПА ПРЫМАЛЬНЫХ ЦЭНАХ

Беларусь цалкам забяспечвае сябе агароднінай

Вытворчасць агародніны ў Беларусі дазваляе цалкам забяспечыць рынак айчыннай прадукцыяй, паведаміў начальнік управлення арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Міхаіл ЖЫГАЛА.

— Па нашых разліковых даных, гадавая патрэба ў агародніне для продажу насельніцтву праз усе каналы рэалізацыі складае менш за 50 працэнтаў ад аб'ёму вытворчасці ў сельгасарганізацыях і сялянскіх (фермерскіх) гаспадарках, — сказаў Міхаіл Жыгала.

СТАР. 3

Дзяржаўны інтарэс

НОВАЕ СЛОВА Ў МІКРАБІЯЛОГІІ

Як навукоўцы ствараюць канкурэнтаздольную біятэхналагічную галіну

Фота Інстытута мікрабіялогіі НАН.

Дзякуючы навуковым прарывам у свеце біятэхналогій за апошняе дзесяцігоддзе яны па інвестыцыйнай прыцягальнасці даганяюць IT-індустрыю. Менавіта біятэхналогіі адкрылі масу новых магчымасцяў у сельскай гаспадарцы, экалогіі, харчовай прамысловасці і медыцыне. Інстытут мікрабіялогіі НАН Беларусі з'яўляецца вядучым навукова-даследчым цэнтрам Беларусі ў галіне мікрабіялогіі і біятэхналогій. Яго дырэктар — член-карэспандэнт НАН, доктар біялагічных навук, заслужаны дзеяч Рэспублікі Беларусь Эмілія КАЛАМІЕЦ — была прызнаная «Вучоным года НАН Беларусі» па выніках 2017 года. Менавіта яна сфарміравала і актыўна развівае айчынную навуковую школу па вывучэнні біягенезу біялагічна актыўных злучэнняў з антымікробным дзеяннем і стварэнні біялагічных сродкаў абароны раслін і жывёл. Па ініцыятыве Эміліі Каламіец на базе Інстытута мікрабіялогіі былі створаны Цэнтр аналітычных і генна-інжынерных даследаванняў, Навукова-вытворчы цэнтр біятэхналогій па выпуску біяпрэпаратаў з высокім экспартным патэнцыялам, наладжаны доследна-прамысловая вытворчасць мікробных прэпаратаў, тэхналагічная лінія па вытворчасці ферментаў для біясінтэзу лекавых субстанцый і атрымання дыягностыкумаў.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Пачалася падпіска на «Звязду» на IV квартал 2020 года

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«ВЫРАСЛА НОВАЕ ПАКАЛЕННЕ ЛЮДЗЕЙ»

Андрэй Швед, які да ўчарашняга дня ўзначальваў Дзяржаўны камітэт судовых экспертыз, назначаны генеральным пракурорам Беларусі. Адпаведнае кадравае рашэнне прыняў 9 верасня Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

«Яшчэ раз хачу нагадаць, карыстаючыся выпадкам, для асабліва «дасведчаных», якія ці то хайпуюць, ці то посяцца ў інтэрнэце наконт маіх кадравых назначэнняў: напэўна, гэта натуральны працэс (кадравыя назначэнні) пасля выбараў. Як у любой дзяржаве. ***Асноўны касцяк, ва ўрадзе асабліва, мы сфарміравалі да выбараў, каб людзі бачылі, з кім Прэзідэнт плануе працаваць пасля выбараў. Ну і, зразумела, як гэта прынята гаварыць, пэўная даводка заўсёды ёсць пасля выбараў».*** — цытуе кіраўніка дзяржавы яго прэс-служба.

Ён падкрэсліў, што Аляксандр Канюк працаваў на пасадзе генеральнага пракурора дзевяць гадоў. «Больш за тое, чалавек надзейны, дзяржаўны, чалавек ваенны, прайшоў Афганістан, мы гэта ведаем. Ведае замежныя мовы. У яго ёсць жаданне папрацаваць на дыпламатычнай службе. Я не пярэчу супраць такога жадання. Трэба звязацца з міністрам замежных спраў і папрасіць яго падрыхтаваць свае прапановы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Гаворачы пра Андрэя Шведа, Прэзідэнт адзначыў, што гэта, напэўна, самы падрыхтаваны чалавек для такой пасады, ён прайшоў многія ступені ў праваахоўных органах, працаваў і ў пракуратуры. ***«Думаю, што гэта будзе правільнае назначэнне на пасаду генеральнага пракурора.*** Але што мяне асабліва задавальняе, аб ім добрай думкі ў самой пракуратуры. Гэта, як яны кажуць, наш чалавек», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка даручыў накіраваць неабходныя дакументы на ўзгадненне ў Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу. Ён таксама папрасіў раніцай 10 верасня сабраць цэнтральны апарат генеральнай пракуратуры, запрасіць абласных пракуроraў. «Я асабіста прыеду і прадстаўлю генеральнага пракурора. Тым больш што ёсць аб чым пагаварыць, няхай коратка, з супрацоўнікамі цэнтральнага апарату», — сказаў Прэзідэнт.

«Многія СМІ, я аналізую, пачалі пагаворваць (вы ведаеце, якія гэта сродкі масавай інфармацыі), што ў нас з'явіўся нейкі дэфіцыт кадраў, ледзь не ажыятаж. ***Ніякага ажыятажу няма. Гэта я канстатую адназначна. Выросла новае пакаленне людзей, спецыялістаў. Дарэчы, вопытных людзей, не проста збоку схапілі, назначылі.*** А людзі, якія прайшлі пэўныя ступені, і не толькі ў гэтым выпадку ў пракуратуры, а ва ўсім праваахоўным блоку», — падкрэсліў беларускі лідар.

Ён пажадаў Андрэю Шведу паспяхаў у рабоце. «Няма неабходнасці мне неяк вас настаўляць на новай пасадзе. Вы лепш за мяне ведаеце, чым там займацца. А заўтра раніцай пагаворым з вашымі калегамі, дастойна Аляксандра Уладзіміравіча (Канюка. — **«Зв.»**) праводзім. Думаю, ён прынясе нам нямала карысці», — рэзюмаваў кіраўнік дзяржавы.

Парламенцкі дзённік

Без знешняга ціску і ўмяшання

Андрэй САВІНЫХ выказаўся катэгарычна супраць стварэння знешнімі сіламі фінансавых фондаў для падтрымкі пратэсных настрояў у Беларусі

Пра гэта ён заявіў падчас выступлення на пасяджэнні камісіі Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы па палітычных пытаннях і дэмакратыі, на якім абмяркоўваліся вынікі прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі.

Пасяджэнне адбылося 8 верасня ў фармаце відэаканферэнцыі, у ім узялі ўдзел старшыня ПАСЕ Рык Дамс, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах Андрэй Савіных, экс-кандыдат у прэзідэнты Беларусі Святлана Ціханоўская, прадстаўнікі краін-членаў Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы.

Старшыня камісіі ПАСЕ па палітычных пытаннях і дэмакратыі Шэрыл ГІЛАН нагадала, што Парламенцкая асамблея Савета Еўропы сочыць за сітуацыяй у Беларусі з 1992 года, калі Нацыянальны сход нашай краіны атрымаў статус спецыяльнага запрошанага ў гэтай арганізацыі. Па яе словах, і пасля зняцця гэтага статусу ў 1997 годзе асамблея працягвала трымаць адкрытымі дзверы дыялогу з беларускім парламентам, з прадстаўнікамі апазіцыі і з прадстаўнікамі грамадзянскай супольнасці.

«Мы зацікаўленыя ў прадаўжэнні канструктыўнага дыялогу з усімі зацікаўленымі бакамі, уключаючы беларускія ўлады і грамадзянскую супольнасць, і гатовы падтрымаць іх як з палітычнага пункту погляду, так і з пазіцыі назапашанага вопыту ў правядзенні мірнага і дэмакратычнага нацыянальнага палітычнага працэсу фундаментальных рэформаў, пачынаючы з Канстытуцыі і выбарчай сістэмы», — сказала старшыня профільнай камісіі ПАСЕ.

На думку **старшыні ПАСЕ Рыка ДАМСА**, Беларусь зараз зведвае цяжкі крызіс, разам з тым, падобны працэс зусім неабавязкова прыводзіць да рэвалюцыі, якая можа каштаваць занадта дорага, а вынікі яе часта бываць незразумелыя.

«Гэта можа прывесці і да эвалюцыі, — сказаў ён. — Калі ўсе зацікаўленыя бакі, усе ўдзельнікі працэсу будуць разам працаваць над дасягненнем выніковай мэты і падтрыманнем нашых агульных каштоўнасцяў: вяршэнства права, дэмакратыі і правоў чалавека. Менавіта такога вырашэння падзей хочам мы — Савет Еўропы».

Для асамблеі і запрошаных на пасяджэнне яе камісіі гасцей маецца, па словах старшыні ПАСЕ, толькі адно пытанне, на якое трэба знайсці адказ: «Вы, і тыя, каго вы прадстаўляеце, хочаце быць часткай праблемы альбо хочаце стаць і можаце знайсці ў сабе сілы стаць часткай рашэння гэтай праблемы?»

Рык Дамс адразу адказаў, што Парламенцкая асамблея жадае стаць часткай пошуку ў вырашэнні існуючай у Беларусі праблемы і гатова падтрымаць тых, хто адказвае на пастаўленае пытанне такім жа чынам.

Андрэй Савіных у сваім выступленні адзначыў, што прэзідэнцкая кампанія ў Беларусі характарызавалася найбольшай інтэнсіўнасцю за ўвесь перыяд правядзення выбараў на гэты пост у краіне.

«На жаль, мы вымушаныя канстатаваць, што дзеянні асобных прэтэндэнтаў на пост прэзідэнта былі нацэленыя на фарміраванне палітычнай і сацыяльнай напружанасці ў грамадстве. Шырока выкарыстоўвалася дэзынфармацыя, псіхалагічныя прыёмы, маніпуляцыі свядомасцю людзей, — сказаў ён. — Гэта вельмі моцна адрозніваласа ад палітычнай культуры, якую мы, дэпутаты, ды і іншыя палітычныя інстытуты нашага грамадства, імкнуліся развіваць усе гэтыя гады».

Па яго словах, пасля завяршэння асноўнага дня галасавання палітычныя эмоцыі выйшлі з цывілізаваных межаў. «Беларускія ўлады маюць інфармацыю пра тое, што пратэсты былі дасканала спланаваныя і каардынаваліся ў тым ліку праз сацыяльныя сеткі з-за мяжы, — звярнуў увагу беларускі дэпутат. — Па гэтых каналах каардынаваўся рух калон пратэстоўцаў па горадзе, у рэжыме рэальнага часу аддаваліся каманды на правядзенне акцый, на збор людзей у асобных месцах. Прыёмы, якія былі выкарыстаныя, дзіўным чынам паўтараюць тэхнікі кіравання майданам ва Украіне, каляровыя рэвалюцыямі ў Егіпце, Сербіі і шэрагу іншых краін».

Беларускі парламентарый таксама запэўніў, што пратэсты, якія адбыліся ў дзень галасавання і адразу пасля яго, мелі гвалтоўны характар, у выніку пацярпелі прадстаўнікі праваахоўных органаў. «У гэтых экстраардынарных умовах асноўнай задачай сілавых ведамстваў стала папярэджанне разрастання сілавога сцэнарыя канфлікту. Мы добра ведаем, што праваахоўныя структуры заходніх краін рэагуюць у такіх сітуацыях падобным чынам. Як толькі пратэсты набылі мірны характар, пазіцыя праваахоўнікаў таксама змянілася. Аднак у выпадку новых правакацый яны будуць вымушаныя выкарыстоўваць сілу», — дадаў Савіных.

Па выніках абмеркавання Андрэй Савіных адзначыў, што быў здзіўлены неразуменнем міжнароднымі партнёрамі тых працэсаў, якія адбываюцца ў Беларусі. «Прытым што людзі (удзельнікі пасяджэння. — **«Зв.»**) казалі шчыра, але было цалкам бачна, што яны зыходзяць з нейкіх сваіх уяўленняў пра тое, як развіваюцца палітычныя працэсы ў іх краінах, і накладваюць гэтыя ўяўленні на працэсы ў Беларусі. Я са свайго боку пастараўся растлумачыць ім, што Рэспубліка Беларусь рухаецца па шляху развіцця дэмакратычных стандартаў, дэмакратычных інстытутаў, але робіць гэта ў інтарэсах, перш за ўсё, уласных грамадзян, стабільнага развіцця нашай краіны».

Ён падкрэсліў: «У гэтай сувязі мы, вядома, катэгарычна супраць любых знешніх сіл, якія ствараюць фінансавыя фонды для таго, каб падтрымліваць пратэсныя настроі ў Рэспубліцы Беларусь. Фактычна гэта прыводзіць да развіцця сітуацыі па мадэлі «пратэсты ў абмен на заробак». Гэта не вядзе да стабільнасці, гэта ўмацоўвае недавер паміж рознымі сацыяльнымі групамі ў нашай краіне, гэта, зрэшты, запавольвае развіццё дэмакратычных традыцый».

На пасяджэнні камісіі ПАСЕ Андрэй Савіных таксама выказаўся пра недапушчальнасць умяшання, якое накіравана на безальтэрнатыўную перадачу ўлады трэцяй сіле. «Гэта абсурдна, бо ўлада ў Беларусі стабільная, улада ў Беларусі працуе ў інтарэсах усяго грамадства, у інтарэсах простых людзей, і мы будзем рэалізоўваць і надалей гэту палітыку — палітыку сацыяльнай дзяржавы», — упэўнены старшыня камісіі Палаты прадстаўнікоў.

Пры гэтым Андрэй Савіных запэўніў еўрапейскіх калег, што Беларусь зацікаўленая ў шырокім унутраным дыялогу з удзелам максімальнай колькасці легітымных грамадскіх і палітычных арганізацый для мадэрнізацыі палітычнай сістэмы ў Беларусі.

«Гэты дыялог можа ўключаць любыя пытанні, якія ўяўляюць інтарэс для беларускага грамадства, гэты дыялог, па логіцы, павінен завяршыцца распрацоўкай новых палажэнняў Канстытуцыі, якая мадэрнізуе і палітычную сістэму Беларусі, якая можа закрануць і выбарчае заканадаўства, і законы пра масавыя мерапрыемствы, і ўмацуе істотным чынам ролю палітычных партый. Цалкам магчыма, што мы прыйдзем да прапарцыянальнай сістэмы прадстаўніцтва выбарных органаў, уключаючы парламент, — растлумачыў журналістам дэпутат. — Тым не менш гэта не ёсць маё рашэнне, гэта не ёсць рашэнне некага аднаго ў Рэспубліцы Беларусь. Гэты дыялог павінен стаць вынікам грамадскага абмену думкамі, якое выпрацуе ўмовы для палітычнага і эканамічнага развіцця нашай краіны».

Андрэй Савіных дадаў таксама, што вітае ўдзел міжнародных партнёраў у падтрымцы, у экспертным садзейнічанні развіццю такога дыялогу.

«Формы і метады такога садзейнічання, вядома, будуць вызначаныя пазней пры ўмове, калі нашы партнёры здолеюць забяспечыць адкрыты і ўзважаны, а галоўнае — сяброўскі і паважлівы ўдзел у гэтым працэсе», — рэзюмаваў ён.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

На кантролі

ЯК ІДЗЕ ПЕРАЗАГРУЗКА?

Ці можна лічыць папярэднія вынікі паскоранага развіцця Аршанскага раёна здавальняючымі? Ці могуць даць высокую ацэнку зменам мясцовыя жыхары? Што з напрацаванага вопыту трэба абавязкова пераймаць іншым раёнам краіны? Гэтыя і іншыя важныя пытанні ўчора былі ў цэнтры ўвагі падчас наведвання раёна прэм'ер-міністрам Раманам ГАЛОЎЧАНКАМ і членамі ўрада.

Кіраўнік урада наведаў шмат прадпрыемстваў, дзе рэалізуюцца мерапрыемствы ў рамках выканання Праграмы развіцця Аршанскага раёна. Іх усяго павінна быць рэалізавана каля ста.

У гарадскім пасёлку Балбасава прэм'ер-міністр азнаёміўся з будаўніцтвам мультымадальнага цэнтра «Брэміна-Орша». Тут ужо функцыянуе гіганцкі «корпус», куды з-за мяжы дастаўляюцца тавары для далейшай іх транспарціроўкі. Прадукцыю маркіруюць, афармляюць мытныя дакументы, калі трэба захоўваюць. Тавары з Еўропы ў Азію і наадварот праз «лагістычныя вароты» адпраўляюць і па чыгунцы. А ўвод у эксплуатацыю ўзлётна-пасадачнай паласы даўжынёй каля трох кіламетраў дазволіць выкарыстоўваць і паветраную транспарціроўку. Урачыстае адкрыццё запланавалі на пачатак лістапада. Паралельна з выкарыстаннем гэтай паласы вялікія перспектывы ў запраўцы палівам транспартных самалётаў. Пад Оршай могуць прызямляцца практычна без абмежаванняў крылатыя машыны розных габарытаў і класаў.

Капітальны рамонт узлётна-пасадачнай паласы, рэканструкцыя рулёжных дарожак, узвядзенне аб'ектаў дапаможнага прызначэння ажыццяўляецца ў рамках дзяржаўнай праграмы развіцця транспартнага комплексу Рэспублікі Беларусь на 2016—2020 гады.

Непадалёк знаходзіцца прадпрыемства па рамонце авіяцыйнай тэхнікі, якое таксама наведаў прэм'ер. У павільёне было нямала верталётаў з розных краін, якім беларускія майстры дадуць новае жыццё.

На ААТ «Аршанскі мясакансервавы камбінат» у цэнтры ўвагі было будаўніцтва новага цэха забою і перапрацоўкі мяса свіней і буйной рагатай жывёлы.

Перад пасяджэннем у Аршанскім райвыканкаме Раман Галоўчанка ў гутарцы з прадстаўнікамі СМІ падкрэсліў, што ў Аршанскім раёне былі створаны самыя льготныя ўмовы для таго, каб аздаравіць мясцовую эканоміку, паспрыяць павелічэнню інтарэсу да інвестыцый з боку прадстаўнікоў айчыннага і замежнага бізнесаў.

Падрабязнае вывучэнне зробленага ў адпаведнасці з указам Прэзідэнта і праграмай урада дазволіць распаўсюдзіць запатрабаванае жыццём для паскарэння развіцця ў іншых раёнах, дзе таксама распачалася «перазагрузка». Вельмі важна надаць імпульс для стварэння лепшых умоў у гарадскіх пасёлках. Галоўнае, каб там жылося не горш, чым у абласных цэнтрах.

На нарадзе вялося абмеркаванне не толькі ходу рэалізацыі праграмы. Але і прапаноў па магчымай яе карэкціроўцы. У прыватнасці, па тэрмінах рэалізацыі асобных мерапрыемстваў комплексу, аб'ёмаў і крыніц фінансавання.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЗА АДЗІНУЮ БЕЛАРУСЬ!

У падтрымку бяспекі і стабільнасці

У Магілёўскай вобласці працягваюцца акцыі ў падтрымку міру і спакою ў Беларусі. У старажытным Мсціславе ўжо стала традыцыяй кожны тыдзень праводзіць канцэрты «Беларусь — гэта мы» ў парку міру. Чарговы адбыўся ў сераду.

— Парк міру — самае папулярнае месца ў горадзе, дзе любяць адпачываць нашы жыхары, — удакладняе **начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мсціслаўскага райвыканкама Наталля БІСКУП.** — Сваімі песнямі творчыя калектывы раёна хочуць данесці да людзей, што мы разам і мы за мір. Паколькі зараз ідзе месячнік беларускай сімволікі, у праграме патрыятычныя песні. Такія ж канцэрты праходзяць сёння і ў маленькіх вёсках, там сваю творчасць дэманструюць работнікі клубнай сістэмы.

У адзінай звязцы з артыстамі працуюць і мсціслаўскія бібліятэкары. У цэнтральнай раённай бібліятэцы для дарослых прайшла выстаўка беларускай сімволікі, аналагічнае мерапрыемства плануецца зрабіць і для дзяцей. Сектар спорту і турызму райвыканкама арганізоўвае велапрабегі. Не так даўно велааматары праехалі з чырвона-зялёнымі сцяжкамі па Мсціславе, а аматары армрэслінга паўдзельнічалі ў конкурсе асілкаў. У суботу плануецца правесці яшчэ адзін велапрабег — ад кургана Славы да парку міру ў Мсціславе.

У Чэрыкаве ў сераду адбыўся флэшмоб «Гэта Беларусь мая». Каля 40 хлопцаў і дзяўчат выканалі харэаграфічную кампазіцыю на знакамітую песню «Это — наши города/ Это — белая земля/ Это — мой народ любимый/ Это — Беларусь моя».

— А ўчора мы падтрымалі рэспубліканскую акцыю «Пункты міру», на якой раздавалі жыхарам нашага горада стужачкі і сцяжкі з дзяржаўнай сімволікай, — паведаміў **першы сакратар Чэрыкаўскага раённага камітэта БРСМ Аляксандр ШАРАЕЎ.** — У планах арганізаваць яшчэ і працоўную акцыю — навесці парадак у нашым парку Перамогі.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Меркаванне

Уладзімір ПРАКАПЦОЎ:

«ВЫПРАБАВАННІ СПРАВАМІ...»

На пытанні карэспандэнта «Звязды» генеральны дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі Уладзімір Пракапцоў адказаў у пярэдадзень XXVII Дня беларускага пісьменства ў Бялынічах.

— Уладзімір Іванавіч, нядаўна ў прэс-цэнтры БелТА праходзіла традыцыйная «Экспертная серада». Гаварылі пра выклікі, якія грамадска-палітычная сітуацыя ставіць перад інтэлігенцыяй краіны...

— І я хацеў бы паўдзельнічаць у размове на гэтую тэму. Шкада, што не змог. А ўвогуле, як мне падаецца, пытанне патрэбна ставіць крыху іначай. Варта сёння дыскутаваць, разважаць пра тое, дзе месца нацыянальнай інтэлігенцыі. У стваральных дзеях ці ў акцёрскай барацьбе на вуліцах. Не, я нават не Купалаўскі тэатр маю на ўвазе і ўсё тое, што вакол яго адбываецца. Я проста думаю пра тое, што кожны крок, кожнае рашэнне тых людзей, хто адносіць сябе асабліва да творчай інтэлігенцыі, павінны быць развазлівыя, разумныя. Разбуральныя памкненні — гэта часам выглядае стыльна, смела... Так, для некага смела, можа быць, нават прыгожа, калі ўлічваць мастацкі пункт гледжання. Але што будзе пасля разбурэння і развалу?! Канешне ж, усім зразумелая рытарычнасць гэтага пытання.

— Якой вы бачыце ролю творцаў, мастакоў у шырокім плане — слова, сцэны, мастакоў як майстроў пэндзля, у грамадскім жыцці?

— Грамадскае жыццё, як і палітычнае, заўсёды сувымяраецца з сацыяльнымі памкненнямі грамадства. І адукацыя, культура займаюць сёння не апошнюю ролю ў нашай рэчаіснасці. Пагадзіцеся, і адукацыя, і культура, асветніцкая праца, навуковая работа — усе гэтыя складнікі патрабуюць уніклівай,

Фота Рыгора ПЯСЕЦКАГА.

паўсядзённай карпатлівай працы. Мітынгоўшчына тут не праходзіць. Так, кожны творца — гэта чалавек-адзінка. І, зразумела ж, варта ўлічваць яго індывідуалісцкі характар. Але ў агульнай задачы ўплываў мастацтва, культуры на грамадства нам патрэбна і агульнае разуменне мэт, нам патрэбны адзінства, кансалідацыя ў будаўніцтве суверэннай і незалежнай Беларусі.

Вось нядаўна падзеяй у нашым Нацыянальным музеі сталася выстаўка «Чырвоны код». Колер у розных работах — жывапісе, скульптуры, графіцы — зрабіўся сімвалам, які аб'ядноўвае. І гэты колер, гэтыя работы — з розных часін, розных дзесяцігоддзяў.

— Музей і вы асабіста, Уладзімір Іванавіч, надзвычай шмат робіце для захавання гістарычнай спадчыны ў галіне выяўленчага мастацтва...

— Не буду асобна спыняцца, колькі намі было зроблена па захаванні, кансервацыі Мірскага замка. Гэта частка жыцця, калі хочаце, Нацыянальнага мастацкага... Крыху звярну ўвагу на выдавецкія, кніжныя праекты, звязаныя з прапагандай гісторыі выяўленчага мастацтва Беларусі. Мы ўдзячны, што з музеем у добрых стасунках Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, кніжныя выдавецтвы краіны. І «Беларусь», і «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі», і «Мастацкая літаратура» — з усімі гэтымі выдавецтвамі мы вельмі шмат выпусцілі розных выданняў, якія, несумненна, уплываюць на мастацкае выхаванне грамадства, якія разам уяўляюць сабою гісторыка-мастацкую бібліятэку. Дзяржава істотна паспрыяла нараджэнню гэтых кніг, а людзі творчыя, апантаныя, і выдавецкія работнікі, і нашы музейшчыкі, без лішняга шуму, без пустой валтузні, зрабілі тое, што ўжо сёння можна лічыць з'явай на дзесяцігоддзі. З дапамогай гэтых альбомаў, кніг па-новаму, болей шырока можна прачытаць лёсы В. Бялыніцкага-Бірулі, Ф. Рушчыца, іншых мастакоў, зразумець, асэнсаваць іх адносіны з грамадствам і ўладай.

— Зараз нейкая цішыня ў дачыненні да тэмы Музейнага квартала...

— Гэта ўнікальны праект. І цішыня зараз толькі інфармацыйная. Работы, далейшае праектаванне — усё працягваецца. Я асабіста ўдзячны Прэзідэнту нашай краіны Аляксандру Рыгоравічу Лукашэнку за пастаянную ўвагу да гэтай тэмы. Спадзяюся, што Музейны квартал будзе сапраўдным упрыгожваннем сталіцы Беларусі, будзе прыцягваць у Мінск яшчэ болей турыстаў з далёкага і блізкага замежжа.

— Пандэмія істотна паўплывала на новыя праекты выставачнага характару ў Нацыянальным мастацкім музеі?

— COVID-19 на ўсё, несумненна, паўплывае. Але гэта яшчэ і выпрабаванне для культурна-асветніцкіх устаноў. Нам даводзіцца яшчэ болей генерыраваць ідэй, прыдумваць прывабных творчых праектаў. І шмат што атрымліваецца. Музей з дня ў дзень запрашае на новыя сустрэчы. Запрашаем у музей і чытачоў «Звязды»!..

Гутарыў Мікола БЕРЛЕЖ.

ЯКАСНАЯ ПРАДУКЦЫЯ ПА ПРЫМАЛЬНЫХ ЦЭНАХ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— З чаканых ад сельгасарганізацый 1,1 млн тон бульбы 185 тыс. тон пойдуць на насенне, каля 200 тыс. адправяць на прамперапрацоўку, 181 тыс. тон — на патрэбы гандлю і грамадскага харчавання (у тым ліку для закладкі ў стабілізацыйныя фонды), астатняе — для іншай рэалізацыі, уключаючы экспарт, — адзначыла **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення раслінаводства Мінсельгасхарча Таццяна КАРБАНОВІЧ.** — З чаканага ўраджаю агародніны 180 тыс. тон плануюць накіраваць на патрэбы грамадскага харчавання і гандлю, а таксама для закладкі ў стабфонды, 43 тыс. тон будзе перапрацавана, больш за 400 тыс. тон — для іншай рэалізацыі, уключаючы экспарт. На прамперапрацоўку пойдзе 41 тыс. тон пладоў і ягад, для гандлю, грамадскага харчавання і стабфондаў — 50 тыс. тон, астатняе будзе рэалізавана на рынках, кірмашах і за мяжой.

Рэалізацыя свежай плодаагароднінай прадукцыі будзе ажыццяўляцца па чатырох асноўных каналах. Гэта аб'екты рознічнага гандлю, сельскагаспадарчыя і змешаныя рынкі, кірмашы і спецыяльна адведзеныя пляцоўкі, стабілізацыйныя фонды.

Па словах Таццяны Карбановіч, адзначаецца значнае памяншэнне колькасці прадукцыі, якую закладваюць у стабфонды на міжсезонны перыяд 2020/2021 гадоў у параўнанні з папярэднім міжсезоннем.

— Пытанне закладкі стабфондаў абмяркоўвалася неаднаразова. З боку нашага міністэрства была накіравана прапанова, каб у перыяд масавай уборкі ўраджаю ў сельгасвытворцаў у поўным аб'ёме закуплялі раслінаводчую прадукцыю на міжсезонны перыяд. У працэсе захоўвання ў сельгасарганізацый узнікае вельмі шмат пытанняў, у прыватнасці па выдатках. Трэба сабрацца і выпрацаваць агульнае рашэнне, якое было б выгаднае ўсім.

Пры адсутнасці ў гандлёвых структурах базы захоўвання сельгасарганізацыі гатовыя на платнай аснове заключаць дагаворы на захоўванне прадукцыі ў міжсезонне ў сваіх спецыялізаваных сховішчах.

Мінсельгасхарч пастаянна працуе з МАРГ, Белкаапсаюзам, канцэрнам «Белдзяржхарчпрам» па пытаннях забеспячэння насельніцтва і перапрацоўчых прадпрыемстваў плодаагароднінай прадукцыяй. Як адзначыў прадстаўнік МАРГ, яшчэ ў пачатку жніўня быў зацверджаны план мерапрыемстваў па забеспячэнні насельніцтва свежай плодаагароднінай прадукцыяй ураджаю 2020 года. Ён прадугледжваў забеспячэнне першачарговых паставак вырашчанай прадукцыі на ўнутраны рынак, арганізацыю сельскагаспадарчых кірмашоў, пашырэнне месцаў продажу, стварэнне рабочых груп па маніторынгу гатоўнасці агароднінасховішчаў да закладкі прадукцыі, правядзенне кантрольна-аналітычных мерапрыемстваў на рознічных гандлёвых аб'ектах.

Сёлета ў гаспадарках Беларусі ўсіх катэгорый чакаецца вытворчасць бульбы на ўзроўні 6,1 млн тон, пладоў і ягад — 601 тыс. тон, агародніны — 1,76 млн тон. У тым ліку ў сельгасарганізацыях і сялянскіх (фермерскіх) гаспадарках плануюць атрымаць 1,1 млн тон бульбы (на ўзроўні мінулага года), 170 тыс. тон пладоў і ягад (на 8 % больш), з іх 160 тыс. тон яблыкаў, а таксама 625,5 тыс. тон агародніны з адкрытага і закрытага грунту (на 2 % больш). У планах сабраць 146 тыс. тон белакачаннай капусты, 76 тыс. тон сталовых буракоў, 210 тыс. тон морквы, 41,3 тыс. тон рэпчатай цыбулі, 81 тыс. тон таматаў, 51,2 тыс. тон агуркоў, 4,4 тыс. тон зялёнага гарошку, 0,5 тыс. тон фасолі.

— Лічым, што выкананне гэтага плана будзе спрыяць актывізацыі продажу на спажывецкім рынку якаснай беларускай прадукцыі па прымальных цэнах, — дадаў Міхаіл Жыгала. — Яшчэ летась была створана міжведамасная рабочая група па кантролі за насычэннем рынку харчовымі таварамі, у тым ліку сезоннай вытворчасці. У верасні-кастрычніку яе дзейнасць будзе сканцэнтравана на пытаннях забеспячэння плодаагароднінай прадукцыяй.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Здарэнне

РАТАВАЛЬНІКІ ЗНАЙШЛІ 97-ГАДОВУЮ ЖАНЧЫНУ

8 верасня ў 15.16 у цэнтр аператыўнага ўпраўлення Жыткавіцкага раённага падраздзялення МНС паступіла паведамленне аб жанчыне, якая заблукала ў лясным масіве каля вёскі Палосцевічы. Неадкладна да месца пошукаў выехалі ратавальнікі, у тым ліку пошукава-выратавальная група Пінскага цэнтра Рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння МНС.

Як паведамляе МНС, высветлілася, што зніклая 97-гадовая пенсіянерка пражывае ў вышэйназваным населеным пункце. Днём раней прыкладна каля 14.00 жанчына сышла ў лес у грыбы і не вярнулася. Трывогу забіў сацыяльны работнік, не знайшоўшы пенсіянерку дома. Для правядзення пошукаў былі задзейнічаны ратавальнікі, работнікі міліцыі і работнікі Жыткавіцкага лясніцтва. 9 верасня ў 10.19 жанчына была знойдзена ратавальнікамі сумесна з міліцыяй.

Атрад выявіў жанчыну пры абследаванні нежылой часткі вёскі ў высокай траве і хмызняку недалёка ад забалочанага ўчастка прылеглага лесу, што за 800 метраў ад дома пенсіянеркі. Да гэтага моманту яна была знясілена і з цяжкасцю размаўляла. Ёй аказалі першую медыцынскую дапамогу і аператыўна на мотаўсюдыходзе даставілі да месца жыхарства, дзе напаілі гарачай гарбатай і чакалі прыезду брыгады медыкаў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

НОВАЕ СЛОВА Ў МІКРАБІЯЛОГІІ

Унікальная калекцыя

— Біятэхналагічны кірунак у нашай краіне знаходзіцца на годным узроўні і паспяхова развіваецца дзякуючы падтрымцы дзяржавы. Наш інстытут з'яўляецца галаўной арганізацыяй-выканаўцам шэрагу дзяржаўных праграм у сферы біятэхналогій. Таксама мы каардынуем дзейнасць дзяржаўнага навукова-вытворчага аб'яднання «Хімічны сінтэз і біятэхналогіі», — расказвае Эмілія Іванаўна. — Забеспячэнню высокага навуковага ўзроўню даследаванняў і паспяховай камерцыялізацыі распрацовак спрыяюць сфарміраваныя ў інстытуце структуры. Так, у нас сабраная Беларуская калекцыя непатагенных мікраарганізмаў, якая складае аснову біярэсурснай базы біятэхналогій. Яе фонд налічвае больш як 2,5 тысячы штамаў мікраарганізмаў розных таксанамічных груп і пастаянна актуалізуецца. Калекцыя з'яўляецца аб'ектам нацыянальнага здабытку Рэспублікі Беларусь. Мы выдаём мікраарганізмы з нашай калекцыі па запытах навукова-даследчых арганізацый, вышэйшых навучальных устаноў і прамысловых прадпрыемстваў мікрабіялагічнага профілю.

«Мы ўжо працавалі з хімікамі і выраблялі ў невялікіх аб'ёмах біяраскладальныя ніткі для выкарыстання іх у медыцыне. Цяпер збіраемся зрабіць замяняльнік плёнак».

У сферу дзейнасці Цэнтра аналітычных і генна-інжынерных даследаванняў уваходзіць малекулярна-генетычная ідэнтыфікацыя прамыслова каштоўных мікраарганізмаў, канструяванне генна-інжынерных штамаў прадуцэнтаў біялагічна актыўных злучэнняў, секвеніраванне і рэдагаванне геномаў бактэрый і вірусаў.

Магутнасці нашай вопытна-прамысловай вытворчасці разлічаныя на выпуск 30 тон вадкіх прэпаратаў у год. Ёсць тэхналагічная лінія па вытворчасці ферментаў для хіміка-ферментатыўнага сінтэзу лекавых субстанцый і атрымання дыягностыкумаў, якая цалкам забяспечвае патрэбу ўнутранага рынку ў гэтай прадукцыі. Ферменты, што вырабляюцца ў нас, не саступаюць замежным аналагам па ключавых біяхімічных паказчыках (актыўнасці, спецыфічнасці, стабільнасці), пры гэтым іх кошт на 10—15 працэнтаў ніжэйшы.

Навукова-вытворчы цэнтр біятэхналогій спецыялізуецца на выпуску сухіх форм прабіятычных прэпаратаў для кормавытворчасці (праектная магутнасць складае 20 тон у год) і комплексных мікробных прэпаратаў для аднаўлення саставу мікробацэнозаў глебы і павышэння ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур (праектная магутнасць — 56 тон вадкіх мікробных прэпаратаў у год).

Арганічнае земляробства

— А як далёка вашы даследчыкі прасунуліся ў бок стварэння так званай «зялёнай эканомікі»?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— У асартыменце выпускаемай біятэхналагічнай прадукцыі значную ўдзельную вагу займаюць мікробныя прэпараты рознага прызначэння. У сельскай гаспадарцы гэта біялагічныя сродкі аховы раслін, мікробныя ўгнаенні, біярэгулятары, прабіётыкі, біядэзынфектанты, ферментныя прэпараты, біякансерванты расліннай сыравіны. Шмат з іх выкарыстоўваецца ў жывёлагадоўлі і прамысловым рыбаводстве як альтэрнатыва антыбіётыкам, пры гэтым на выхадзе ў вытворцаў атрымліваецца экалагічна чыстая мясная і рыбная прадукцыя. У нас сёння ёсць магчымасць ствараць самыя розныя формы прэпаратаў: сухія, канцэнтраты, грануляваныя, вадкія... Гэта дазваляе нам захоўваць канкурэнтаздольнасць.

Усяго ў Інстытуце распрацавана больш як 60 сучасных біятэхналогій, з якіх найбольшай запатрабаванасцю карыстаецца тэхналогія атрымання біяпрэпарату «Полібакт» для аднаўлення мікробацэнозу глебаў і павышэння ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур. У аснове «Полібакта» — пяць штамаў мікраарганізмаў з рознымі функцыямі, іх трэба было сумясціць і «прымусіць» працаваць сумесна, каб яны не падаўлялі адзін аднаго.

«Раней мы ехалі набірацца вопыту ў расійскіх калег, а тыя, у сваю чаргу, набіраліся вопыту ў замежжы. А сёння мы з усімі замежнымі калегамі кантактуем на роўных».

Тэхналогія атрымання прэпарату «Полібакт» стала асновай для распрацоўкі комплексных біяпрэпаратаў «Біякампазіт-карэкт» для Расійскай Федэрацыі і INMI-Phytostim — для КНР. Экспарт перавысіў 750 тысяч долараў ЗША. Для ўнутранага рынку з 2016 года да ліпеня гэтага года было выпушчана і рэалізавана «Полібакта» ў аб'ёме 3215 літраў на суму 291 тысяча рублёў. Прабіятычных прэпаратаў «Спорабакт» і «Спорабакт-К» у сухой таварнай форме, прызначаных для павышэння біялагічнай даступнасці кармоў, карэкцыі мікробацэнозу страўнікава-кішачнага тракту, імунакарэкцыі і актывізацыі працэсаў метабалізму пры вырошчванні маладняку буйной рагатай жывёлы, свіней і птушкі, выраблена 13,3 тоны на суму 203,9 тысячы рублёў, а біяпестыцыду «Бэтапратэкцін» у вадкай форме для абароны агароднінных культур ад захворванняў у працэсе іх вегетацыі і пры захоўванні — 9097 літраў на 51 тысячу рублёў. Выпуск ферментаў склаў 168 мільёнаў адзінак ферментатыўнай актыўнасці на суму 114,2 тысячы рублёў.

«За адзін сезон на прамысловы сад прыпадае да 25 (!) апрацовак хіміяй».

Хачу заўважыць, што распрацаваныя намі біяпестыцыды комплекснага дзеяння, такія як «Бэтапратэкцін», «Полібакт», «Бактасол», «Ксантрэл», «Экагрын», «Фруцін», «Экасад», забяспечваюць эфектыўную абарону ад фітапатагенаў і шкоднікаў, паляпшаюць мінеральнае сілкаванне раслін, павышаюць устойлівасць да стрэсавых умоў. А па канкурэнтаздольнасці яны не саступаюць аналагічным прэпаратам замежных кампаній BASF, Baer CorpScience, Singenta, продажы якіх у 2019 годзе перавысілі 3,5 мільярда долараў ЗША. Выкарыстанне біяпестыцыдаў дапамагае зменшыць хімічную нагрузку на біяцэнозы, бо толькі за адзін сезон на прамысловы сад прыпадае да 25 (!) апрацовак хіміяй. На мікробныя прэпараты за мяжой попыт большы, чым у нашай краіне. Актыўна ім цікавяцца ў Расіі, краінах Еўрасаюза. У Беларусі, на мой погляд, выкарыстанне экалагічна бяспечных сродкаў аховы раслін таксама будзе ўзрастаць, бо ўжо ўступіў у сілу закон аб арганічным земляробстве. Па прагнозах спецыялістаў Мінсельгасхарча, патрэба ў іх можа скласці да 800 тон у год у пераліку на вадкую таварную форму.

Нашы айчынныя прабіятычныя прэпараты і кармавыя дабаўкі «Білавет-С», «Спорабакт», «Бактахэлс», «Эмілін» і іншыя па тэхналагічных і мікрабіялагічных характарыстыках таксама не саступаюць найлепшым замежным аналагам. Пры гэтым кошт ліяфільна высушанай бактэрыяльнай біямасы з высокім паказчыкам КОЕ/г (маецца на ўвазе колькасць жыццяздольных клетак у 1 граме прэпарату) у 2,5-3 разы ніжэйшы, чым у імпартных аналагаў. Па звестках Мінсельгасхарча, агульная патрэба ў прабіятычных прэпаратах для выкарыстання ў якасці лячэбна-прафілактычных сродкаў складае каля 50 мільёнаў доз у год, для кармавой вытворчасці — звыш 1 000 тон у год...

Альтэрнатыва пластыку

— Ці развіваюцца ў Беларусі прыродаахоўныя біятэхналогіі?

— Экалагічны напрамак — вельмі важны ў нашай рабоце. У інстытуце распрацаваны навуковыя асновы стварэння экалагічна бяспечных тэхналогій ачысткі забруджаных прыродных і вытворчых асяроддзяў, створаны мікробныя прэпараты сістэмнага выкарыстання для інтэнсіфікацыі ачысткі сцёкавых водаў камунальна-бытавых і прамысловых прадпрыемстваў, распрацаваныя і ўкаранёныя ў практыку эфектыўныя тэхналогіі рэкультывацыі нафтазабруджаных глеб з дапамогай нашых прэпаратаў «Экабел», «Радабел-Т» і «Радабел-ТН».

«У аснове «Полібакта» — пяць штамаў мікраарганізмаў з рознымі функцыямі».

Укаранёна больш за 35 тэхналогій абсарбцыйна-біяхімічнай ачысткі вентыляцыйнага паветра ад таксічных арганічных злучэнняў на шэрагу прадпрыемстваў аўтамабільнай, металургічнай, дрэваапрацоўчай, хімічнай і іншых галін прамысловасці Беларусі, Расіі і Украіны (сумесна з унітарным прадпрыемствам «Прамысловыя экалагічныя сістэмы»). У лабараторыі прыродаахоўных тэхналогій створана калекцыя мікраарганізмаў — дэструктараў шырокага спектра арганічных злучэнняў.

Сёння ў цэнтры нашай увагі — біяраскладальныя палімеры. Мы ўжо працавалі з хімікамі і выраблялі ў невялікіх аб'ёмах біяраскладальныя ніткі для выкарыстання іх у медыцыне. Цяпер збіраемся зрабіць замяняльнік плёнак. Плануем пабудаваць вялікі цэх па выпуску малочнай кіслаты. Паліімалочная кіслата з'яўляецца ўніверсальным біяраскладальным тэрмапластычным матэрыялам, які атрымліваюць на аснове малочнай кіслаты. Гэта вельмі перспектыўная альтэрнатыва палімерам, што атрымліваюць з нафты. Пакуль што малочная кіслата ў нашай краіне не вырабляецца.

Плануем таксама стварыць дэзынфектанты на аснове бактэрыяфагаў, здольных мэтанакіравана здзяйсняць лізіс патагенных бактэрый. У некаторых гаспадарках сцены жывёлагадоўчых ферм настолькі інфіцыраваны патагенамі, што хімічная апрацоўка ўжо не дапамагае. Таму трэба шукаць мікраарганізмы-антаганісты, якія будуць кантраляваць рост узбуджальнікаў хвароб. Тое ж самае і з сістэмамі вентыляцыі — галоўным рассаднікам патагеннай мікрафлоры. Трэба знайсці фагі, якія будуць мэтанакіравана на яе ўздзейнічаць. Яшчэ адным важным для нас кірункам стане распрацоўка ачышчальных сродкаў з прабіятычнай актыўнасцю, якія будуць утрымліваць мікраарганізмы, здольныя не толькі падаўляць патагены, але і прадуцыраваць ферменты для эфектыўнай ачысткі паверхні.

Кантакты на роўных

— А ці актуальная для вашага навуковага калектыву праблема з амаладжэннем кадраў?

— 58 працэнтаў ад агульнай колькасці даследчыкаў у нашым інстытуце складаюць маладыя людзі ва ўзросце да 35 гадоў. У нас шмат маладых на пасадзе загадчыка лабараторыі і на іншых кіруючых пасадах. Таму ў будучыню я гляджу з аптымізмам. У інстытуце працуюць 4 дактары і 31 кандыдат навук, рыхтуюцца абароны новых доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый. Да нас сёння прыходзяць працаваць і мікрабіёлагі, і біятэхнолагі, і хімікі, і батанікі, і медыкі. Усе знаходзяць сабе прымяненне. Лічу, што таленавітай моладзі вельмі прэстыжна ісці ў навуку, бо тут ты ніколі не стаіш на месцы. Ёсць магчымасць наведваць міжнародныя канферэнцыі, паехаць на стажыроўку ў замежжа. Я ў навуцы даўно, працавала яшчэ ў часы Савецкага Саюза і разумею, наколькі вялікая розніца ў тым, што мы маем цяпер, з тым, што было раней. Зараз мы самадастатковыя, маем сучаснае абсталяванне, лабараторыі, усю базу, неабходную для даследаванняў. Гэта вельмі важна, калі ты маеш увесь інструментарый для ўвасаблення сваіх ідэй на практыцы. Раней мы ехалі набірацца вопыту ў расійскіх калег, а тыя, у сваю чаргу, набіраліся вопыту ў замежжы. А сёння мы з усімі замежнымі калегамі кантактуем на роўных.

Дарэчы, прызнаннем аўтарытэту Інстытута мікрабіялогіі стала зацвярджэнне яго ў якасці галаўной арганізацыі-распрацоўшчыка і каардынатара міждзяржаўнай мэтавай праграмы ЕўрАзЭС «Інавацыйныя біятэхналогіі». Таму мы — з нашымі тэхналогіямі, распрацоўкамі і кадрамі — упэўнена рухаемся ў правільным напрамку.

Надзея НІКАЛАЕВА.
Фота Інстытута мікрабіялогіі НАН.

Сямейная газета

Выпуск № 17 (153)

І ПРЫ ЧЫМ ТУТ РАГАЛІКІ?

У чарговы раз чакаючы з далёкай паездкі бацьку, мой двухгадовы сынок вырашыў спячы свайму любімчыку рагалікі. Ідэя, канешне, мая. Арцёмка вырашыў толькі дапамагчы. Мы так хораша стаялі каля стала (ускараскаўшыся на табурэт, малы быў амаль роўны са мной) і раскатвалі цеста, пасля намазвалі яго ўзбітым яечным бялком і скручвалі патрэбныя нам фігуркі, прыгожа выкладаючы іх на бляху...
Але раптам нешта пайшло не так.

Мой маленькі памочнік пачаў церусіць муку не на раскатаны «блін», а на падлогу, пры гэтым з радасцю прыгаворваючы: «Пыл!» Я, вядома, зрабіла заўвагу, пасля другую. Але Цёмка так захапіўся новым заняткам, што папросту мяне не чуў. І майму цярпенню прыйшоў канец... Выправадзіўшы малога шкодніка з кухні, я працягвала круціць рагалікі, з роспаччу думаючы, што дарэмна я так: яму ўсяго два гадкі, ён вырашыў мне дапамагчы, а я сваімі дзеяннямі, хутчэй за ўсё, загубіла ў ім будучага шэф-кухара якога-небудзь элітнага рэстарана.

І так амаль заўсёды. Спачатку маладыя маці не даюць сваім дзецям праявіць самастойнасць (мама ж зробіць лепш і, галоўнае, хутчэй!), а потым здзіўляюцца, што іх ужо дарослыя дзеці не тое што пельмені не могуць зварыць, нават пыласосам карыстацца не ўмеюць. Сярод іх — і мае стрыечныя браты. Ім ужо каля сарака, а яны па-ранейшаму жывуць з мамай. І не таму, што няма дзе (старэйшы ўжо пабудаваў уласнае жыллё), а таму, што не ўмеюць сабе нават бульбы зварыць (і гэта ў век інтэрнэту!). А ўсё таму, што ўвесь час жылі з бабуляй. Тая, пакуль магла, сваіх унукаў даглядала: на кухню не падпускала (усё сама!), з вёскі паўнюткія торбы з гароднінай цягала (баялася лішні раз адарваць ад справы сваіх хлопчыкаў), нават шкарпэткі ім, ужо дарослым, мыла! Вось і атрымалася тое, што атрымалася. Сёння ўсё тое самае за іх робіць маці, якая ўжо, між іншым, на пенсіі...

А ўсё пачынаецца са звычайных фраз: «Сынок, дай я шнурочкі завяжу, так хутчэй», «Давай я сама цябе пакармлю, а то ты запэцкаеш усё адзенне», «Сама цацкі паскладваю, а ты хутчэй ідзі спаць»... Вось і я, відаць, недалёка адышла, выгнаўшы Цёмку з кухні.

«Дзеці несамастойныя, калі гэта выгадна дарослым», — прачытала я нядаўна ў адной досыць папулярнай аўтаркі Ганны Быкавай, якая вельмі даступна піша пра дзіцячую псіхалогію. І яно сапраўды так. Навошта дзіцяці даваць тую ж лыжку, калі я сама яго магу пакарміць: па-першае, так будзе спарней, па-другое, мне пасля не давядзецца мыць адзенне і прыбіраць усё навокал. А, з іншага боку, як яшчэ дзіцяці навучыцца есці, калі не метадам спроб і памылак?!

Я ўсё гэта разумею, таму своечасова выконваю «работу над памылкамі». Мой Цёмік ужо амаль без промахаў не толькі арудуе лыжкай, але і відэльцам. Сам выносіць за сабой гаршчок і прыбірае цацкі (не без ультыматуму, канешне). Летам мы разам збіралі клубніцы (няхай часам і зялёныя), цяпер Цёмік з задавальненнем ходзіць па моркву (хоць ірве ўсю запар), лушчыць з бабуляй фасольку, якая разлятаецца па ўсёй кухні. Праз акно бачыла, як дапамагаў бацьку выбіваць дыванкі, мыць машыну ды паліваць (правільней, заліваць!) вадой кветкі. Затое — сам!

У наступны раз, калі будзем пячы рагалікі, абяцаю быць не такой катэгарычнай, бо, як ні кажы, а самая важная місія бацькоў — навучыць дзіця быць самастойным.

Вераніка КАНЮТА.

Тыя, хто побач

ЗВЫЧАЙНЫЯ НЕЗВЫЧАЙНЫЯ КЛОПАТЫ

Навіна пра тое, што яна стане мамай, была нечаканай. Тады Алена не верыла ў гэты цуд. Тое, што ў іх будзе першынец, муж-дальнабойшчык даведаўся ў камандзіроўцы — яго шчасцю не было межаў. Будучы бацька марыў пра хлопца, а цяжарная Алена прыглядалася ў крамах да ружовых панчошак ды сукеначак для маленькіх прыгажунь. На 23-м тыдні УГД паказала, што будзе дзяўчынка. Як пра гэта сказаць мужу, каб той не маркоціўся і не хваляваўся, маладая маці нават не ўяўляла... Цяпер жа гэтыя перажыванні ў сям'і ўспамінаюць з гумарам, тым больш што праз два з паловай года на свет з'явіўся і доўгачаканы хлопчык. Як праходзіць звычайны дзень новаспечанай маці, чым заняць дзяцей з маленькай розніцай ва ўзросце і як не забыцца на сябе падчас хатніх клопатаў, «СГ» расказала маладая матуля з Оршы Алена КАСЦЯНКА.

(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)

Вечная тэма

СУМЯСЦІЦЬ КАРЫСНАЕ З ПРЫЕМНЫМ

Большую частку жыцця многія праводзяць на рабоце, а значыць, «службовыя раманы» былі, ёсць і будуць

Патрэба кахаць і быць каханым — адна з базавых «настроек» homo sapiens. Ва ўсе часы чалавек шукае сабе пару. Нягледзячы на «залаты век» сэрвісаў анлайн-знаёмстваў, па-ранейшаму зручней за ўсё рабіць гэта ў сваім асяроддзі. Напрыклад, у працоўным калектыве. На працы мы праводзім па восем (і больш) гадзін пяць дзён на тыдзень. І калі працуем у адным калектыве доўга, то калегі паступова становяцца нам бліжэйшыя, чым сваякі. Мы бачым саслужыўцаў у розных сітуацыях. Ведаем, як калега рэагуе на стрэсы і ўспрымае асабістыя перамогі, як ставіцца да нашых праблем, ці гатовы ён (яна) дапамагчы і падтрымаць... «Службовы раман»: раскласці гэтую з'яву «па палічках» мы папрасілі вядомага сексолага, у нядаўнім мінулым — галоўнага спецыяліста па сексалогіі і сексапаталогіі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Дзмітрыя КАПУСЦІНА.

(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)

На заметку бацькам

НЕ ДАПУСЦІЦЬ ЗАЛЕЖНАСЦІ

Як вызначыць, што падлетак ужывае наркотыкі?

Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

ЗДАВАЛАСЯ б, пра шкоду наркотыкаў вядома шмат. Але падлеткі толькі ўваходзяць у дарослае жыццё і пакуль не маюць псіхалагічнага імунітэту да розных сумніўных прапаноў. Тым больш што некаторыя наркотыкі прэзентуюць як легальныя, а значыць, бяспечныя, але гэта зусім не так. Як вызначыць, што дзіця захапілася не тым, чым трэба? На што павінны звярнуць увагу бацькі? Чаму іх паводзіны часта падштурхоўваюць дзяцей да ўжывання псіхатропных рэчываў? Чаму не трэба баяцца звяртацца да ўрача-нарколага? Пра гэта і іншае мы паразмаўлялі з загадчыкам падлеткавага аддзялення Гарадскога клінічнага наркалагічнага дыспансера Мінска Людмілай ШПАКОЎСКАЙ.

— Калі бацькі ўбачылі прыкметы ўжывання наркотыкаў, як яны павінны дзейнічаць?

— Абавязкова варта звярнуцца да падлеткавага ўрача-нарколага, які вызначыць, ці ёсць праблема, і дапаможа справіцца. Кожная мама лічыць, што яе дзіця добрае і асабліваe. Чаму доўга спіць ці рэзка мяняецца настрой? Дык гэта складаны падлеткавы ўзрост. Ёсць шэраг прыкмет, якія лёгка спісаць на асаблівасці пераходнага ўзросту. Калі праседзець за камп'ютарам чатыры гадзіны, вочы таксама будуць стомленыя і чырвоныя, а калі падчас гульні падлетка пачаць распытваць, ён будзе агрэсіўны і раздражнёны. Таму размова пра тое, што бацькі павінны быць уважлівыя і назіральныя: як мяняюцца паводзіны дзіцяці, наколькі яно адкрытае і гатовае размаўляць. У падлеткавым узросце яны, канешне, закрываюцца. Але ніхто так добра, як мама, не ведае сваё дзіця. І яна дакладна разумее, калі трэба размаўляць, што і колькі сказаць, дзе змаўчаць. Калі яно прыйшло дадому разгубленым, і вы бачыце, што да яго лепш не падыходзіць, не трэба нічога высвятляць, спытаеце пасля.

Увогуле, душэўнае ўзаемадзеянне з бацькамі вельмі важнае. Калі дзіця з маленства гэта адчувае — яны размаўляюць, гуляюць разам, бавяць вольны час ці маюць агульнае захапленне — то любыя змены паводзінаў мама адразу заўважыць. І я не веру, што падлетак адмаўляецца размаўляць з бацькамі, калі гэта рабілася пастаянна. Дзіця павінна дакладна разумець, што бацькі яго любяць любым — не толькі таму, што ён добра вучыцца ці займаецца спортам. Гэта безумоўная любоў — толькі за тое, што ты ёсць. Дзіця можна пакрытыкаваць за непрыстойны ўчынак ці паводзіны, але ніколі нельга казаць, што яно дрэннае.

Нармальна рабіць памылкі, і дзіця павінна гэта ведаць, і пра тое, што ты зрабіў нешта не так, не страшна расказаць бацькам, якія яго зразумеюць і падтрымаюць у любой сітуацыі. Калі ж дзіця адчуе, што бацькі яго не падтрымліваюць, то больш з імі дзяліцца сваімі перажываннямі не будзе.

— Па якіх прыкметах бацькі могуць зразумець, што падлетак ужывае наркотыкі?

— На пачатковых этапах ужывання наркотыкаў прыкметы неспецыфічныя. Але самае галоўнае, на што павінны звярнуць увагу бацькі — гэта змены паводзінаў дзіцяці і яго настрою. Падлетак пачынае паводзіць сябе часам неадэкватна, здараюцца рэзкія перапады настрою, можа мяняцца рэжым дня — ён доўга сядзіць уначы, а потым спіць днём і з цяжкасцю паднімаецца на вучобу. У яго мяняецца кола сяброў, кантактуе з імі ён больш закрыта, незразумелымі фразамі. На адзенні можна заўважыць плямы незразумелага колеру, незнаёмы пах з'яўляецца ад дзіцяці ці ад адзення. Ужо не кажу пра такія яўныя прыкметы, калі бацькі знаходзяць парашкі, таблеткі, скруткі, фольгу, апаленыя лыжкі, кардонкі, бляшанкі. Гэтыя прыкметы больш яўна сведчаць, што падлетак ужывае наркотыкі. Нарэшце, калі вы бачыце прыкметы ап'янення, а паху алкаголю няма, таксама варта задумацца.

Калі бацькі ўважлівыя, яны, безумоўна, адчуюць перамены. Усе спецыфічныя прыкметы, якія называюць урачы-нарколагі, падлеткі хутка вучацца абыходзіць. Кожны падлетак, які першы раз ужыў наркотык, лічыць, што ён ніколі не стане наркаманам, ён проста паспрабаваў.

— А што прымушае спрабаваць яшчэ і яшчэ?

— Наркотыкі ўжываюць, бо гэты стан вельмі падабаецца. І ён адразу ўсплывае ў памяці пры стрэсавай сітуацыі. А яны здараюцца ў нас кожны дзень. Не зрабіў урокі, выклікалі да дошкі, спазняешся ў школу... І калі чалавек, які не ўжывае наркотыкі, з імі лёгка спраўляецца, то ёсць пэўная катэгорыя маладых людзей са слабой нервовай сістэмай, і яны ў групе рызыкі. Таму важна, каб дзіця ўмела спраўляцца са стрэсам.

Зразумела, што не кожны будзе ўжываць наркотыкі, нават калі прапаноўваюць. А ў асоб з лабільнай нервовай сістэмай больш шанцаў у гэта ўвязацца. Таму мы папярэджваем бацькоў, што ў групе рызыкі дзеці, якія хочуць атрымаць усё «тут і цяпер», якія любяць эксперыментаваць, камунікабельныя. І задача бацькоў — шукаць для дзіцяці, пачынаючы з дзяцінства, заняткі, захапленне, гурткі, максімальна займаць яго, каб не было вольнага часу бавіцца глупствамі.



«Наркагандляры становяцца хітрэйшымі і пастаянна прыдумваюць штосьці новае».

У падлетка павінна застацца адна думка — легчы і заснуць. Увесь астатні яго час павінен быць дакладна распісаны і заняты. Ёсць дзеці, якім неабходны «драйв», і зразумела, што ў гуртку кройкі і шыцця ці ў шахматах яму будзе сумна. Таму яго адрэналін трэба перавесці ў станоўчае рэчышча. Цяпер шмат заняткаў для такіх дзяцей — скалалазанне, картынг, фрыстайл.

— Дзе дзеці бяруць наркотыкі? Не ўсе з іх нават маюць кішэнныя грошы...

— Цяпер гэта не праблема. Ёсць інтэрнэт, дзе можна прачытаць усё. Калі гэта першае ўжыванне, то дастаткова невялікіх грошай, а калі скінецца дваторы чалавекі, то гэта наогул не праблема.

— Як развіваецца залежнасць?

— Яе фарміраванне залежыць ад многіх фактараў: стану нервовай сістэмы, ад работы ферментатыўнай сістэмы, ад сацыяльнага акружэння, ад спадчыннасці. Па вялікім рахунку, важна ўсё. Бо спрабуючы першы раз, нехта з дзяцей не зробіць гэтага больш ніколі, а хтосьці — абавязкова паўторыць. Таму наркотыкі — гэта гульня ў рулетку, хтосьці «завязне» пасля першага разу, хтосьці сарскочыць. І са стапрацэнтнай упэўненасцю вызначыць па чалавеку гэтую схільнасць нельга.

— Цяпер кажуць пра тэндэнцыю змяншэння ўжывання наркотыкаў падлеткамі...

— Безумоўна, ужывання наркотыкаў стала менш. Бо і заканадаўчая база стала больш жорсткай, правахоўнікі больш сочаць за шляхамі пранікнення і сайтамі, многія з іх пазакрывалі. З іншага боку, варта ўлічваць, што і наркагандляры становяцца хітрэйшымі і пастаянна прыдумваюць штосьці новае.

Колькасць дзяцей, якія знаходзяцца ў нас пад назіраннем, уключае і тых, хто выпадкова трапіў у поле зроку настаўнікаў або міліцыі ці звярнуўся ананімна. Магчыма, ён адзін раз папіў піва, але ў яго вялікая праблема ў кантактаванні з бацькамі, і мы яе вырашаем з псіхолагам ці псіхатэрапеўтам. Іншая справа — дзеці, якія маюць сіндром залежнасці. Іх з кожным годам усё менш. У Мінску пад назіраннем знаходзіцца каля 3900 непаўналетніх, з іх толькі два падлеткі маюць сіндром залежнасці — адзін ад наркотыкаў, адзін ад алкаголю.

— Зварот да ўрача-нарколага прадугледжвае інфармаванне школы, міліцыі?

— Калі бацькі звяртаюцца да таго моманту, калі падлетка затрымала міліцыя, то любая дапамога аказваецца ананімна. Гэта вельмі важна. Бацькі павінны пра гэта ведаць і не баяцца наркалогіі. Мы не ставім дзяцей на ўлік, нікому гэту інфармацыю не паведамляем — ні школе, каледжу ці ліцэю, ні міліцыі. Падлеткі ананімна атрымліваюць дапамогу, а таксама бясплатнае лячэнне (у адрозненні ад дарослых). Таму чым раней бацькі звернуцца, тым большы шанц, што мы зможам дапамагчы.

«Калі вы бачыце прыкметы ап'янення, а паху алкаголю няма, таксама варта задумацца».

Калі дзеці не маюць сфарміраванай залежнасці, дапамагчы можна амаль усім. Але важна звяртацца своечасова. Часта бацькі прыходзяць і кажуць: «Зрабіце што-небудзь». — «А піць ён пачаў толькі ўчора?» — «Не, два гады таму». Нідзе не вучыцца і не працуе ўвесь гэты час. І мы павінны даць пілюлю, якая зробіць яго такім, якім ён быў два гады таму. Так, на жаль, не атрымаецца.

Калі сітуацыя выйшла з-пад кантролю, падлетак ужывае наркотыкі год ці два, з дому пачынаюць прападаць рэчы, тады гэта сапраўды праблема. Мы разумеем, што тут маецца сіндром залежнасці, і гэта глабальная праблема на ўсё жыццё, і працаваць трэба і з дзіцем, і з бацькамі. Любая залежнасць уключае і бацькоў, і сацыяльнае акружэнне. Часта бацькі самі правакуюць чарговае ўжыванне наркотыкаў, хоць, на першы погляд, усё робяць, каб гэтага не было. І часта нашмат складаней змяніць бацькоў, чым дзіця. Калі дарослыя гатовыя мяняцца і штосьці для гэтага рабіць, то і сын або дачка будзе мяняцца. Таму ўрач заўсёды павінен працаваць з бацькамі падлетка.

— Як адбываецца лячэнне? Гэта псіхатэрапія, ці лекавыя прэпараты таксама выкарыстоўваюцца?

— Усё вельмі індывідуальна. Мы ацэньваем стан падлетка, высвятляем лабільнасць яго псіхікі. На першай сустрэчы ён, скажам, не гатовы размаўляць, таму толькі ў палове выпадкаў мы можам штосьці даведацца. Важна, каб дзіця раскрылася, знайсці з ім кантакт і тое, на што можна паўздзейнічаць: яго характар, захапленні, заняткі. На гэта патрэбны час і некалькі сустрэч з урачом. Калі няма сіндрому залежнасці, то асноўная работа — псіхатэрапеўтычная. Прэпараты могуць прызначацца, але, як правіла, напачатку дастаткова псіхатэрапіі.

Калі мы бачым, што дзіця сапраўды дзесьці «завісае» з псіхатропнымі рэчывамі, хоць залежнасць яшчэ не сфарміраваная, мы можам прапанаваць і стацыянарнае лячэнне, у тым ліку дзённы стацыянар. Частка бацькоў не можа купіць за свае грошы лекі, таму пэўны набор медыкаментаў мы выдаём бясплатна. Дзіця можа наведваць вучэбную ўстанову, але пасля заняткаў яно прыходзіць да нас, працуе з псіхолагам, псіхатэрапеўтам, атрымлівае лекі. Можам пакласці непаўналетняга ў кругласутачны стацыянар, калі разумеем, што інакш не можам вырваць яго з заганнага кола.

Таксама ў нас ёсць такая форма работы, як «Школа кантактавання з дзецьмі» для бацькоў, дзе працуюць урач-нарколаг, урач-псіхатэрапеўт і псіхолаг. Гэтыя заняткі праходзяць кожны аўторак з шасці гадзін вечара. Прыходзіць могуць усе бацькі. Мы расказваем не толькі пра псіхаактыўныя рэчывы і фарміраванне залежнасці, але і пра асаблівасці падлеткавага ўзросту, як трэба кантактаваць з падлеткамі, што ўлічваць і як сябе паводзіць. Мы чакаем усіх бацькоў.

— Куды звяртацца па падлеткавага ўрача-нарколага?

— У нас ёсць адзіны тэлефон 209-09-09, гэта нумар гарадскога наркалагічнага дыспансера. Там можна атрымаць любую інфармацыю: куды звяртацца, нумар тэлефона, графік работы. На базе 5-й дзіцячай паліклінікі Мінска знаходзяцца кабінеты падлеткавых урачоў-нарколагаў Ленінскага, Заводскага, Партызанскага, Кастрычніцкага, Фрунзенскага і Маскоўскага раёнаў. На вуліцы Кальцова пакуль працуюць кабінеты Савецкага і Цэнтральнага раёнаў, а ў 11-й дзіцячай паліклініцы — кабінет Першамайскага раёна.

Алена КРАВЕЦ.

ЗВЫЧАЙНЫЯ НЕЗВЫЧАЙНЫЯ КЛОПАТЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Дзень Алены пачынаецца а сёмай раніцы — да гэтага яе прывычылі дзеці. Пакуль маладая маці ў ванным пакоі, пакрысе пачынаюць падымацца і малыя. Сын Кірыл прачынаецца рана, што не скажаш пра яго сястрычку Арынку. Тая любіць зрабіць выгляд, быццам у садок ёй не трэба. «Што цікава, — здзіўляецца паводзінам сваіх гарэззаў Алена, — у выхадны дзень гэтыя жэўжыкі раніцай доўга не спяць, і маё жаданне хоць крыху адпачыць зноў не спраўджваецца».

Кожны будні дзень для жанчыны праходзіць у прыемных турботах: пакуль гатуецца сняданак для дзяцей, маці можа папіць кавы, потым заплесці коскі малой. Адзенне ў садок ужо падрыхтаванае напярэдадні, хоць іншы раз Арына праяўляе няўрымслівы характар і ўпарта адмаўляецца надзяваць тое, што сама выбірала яшчэ ўчора. Любіць таксама паспрачацца наконт цацак, якія запланавала браць з сабой у садок. Тут патрэбна цярплівасць матулі... і не толькі. Брацік, як сапраўдны джэнтльмен, амаль заўсёды церпіць дзявочыя свавольствы сваёй чатырохгадовай сястрычкі. «Так, — расказвае Алена, — на мінулых выхадных дзеці адпачывалі ў бабулі. Кірыл захацеў папіць. Заўважыўшы гэта, Арынка падбегла да яго і... наўпрост адабрала кубачак. Калі ёй зрабілі заўвагу, то адказала, што старэйшая, таму ён павінен саступаць. Спакойная рэакцыя малога заслугоўвала павагі. Вось так выхоўваецца вытрымка!» — усміхаецца суразмоўніца.

Маладая жанчына саджае ў каляску свайго сыночка. Арынка ўжо ведае, што трэба прытрымаць дзверы альбо ўзяць з рук маці нейкія рэчы: нягледзячы на няпросты характар, у такія моманты яна вельмі дапамагае.

Пасля таго як малую завялі ў садок, гаспадыні трэба паклапаціцца пра абед. Вядома, калі муж вяртаецца з рэйсу, то дапамагае жонцы па доме. Аднак такое выпадае не часта. Для малых Алене трэба на адзін-два дні прыгатаваць суп. Дачка харчуецца ў садку, і гэта ўжо палёгка. Каля адзінаццатай гадзіны жанчына выходзіць з каляскай на шпацыр — добра, што побач з домам ёсць алея, а паблізу працякае Дняпро... Далей па

Алена мяркуе, што, вядома, трэба як мага раней паспрабаваць дзіця ў розных занятках, але ў выніку яно само павінна вырашыць, чым хоча займацца.

раскладзе — сілкаванне і пасляабедзенны сон. Гэтым часам матуля таксама можа дазволіць сабе крыху адпачыць ці заняцца, напрыклад, прыборкай. Пасля дзённага сну ў Кірыла — падвячорак, звычайна гэта ёгурт альбо пюрэ з садавіны. Дарэчы, улетку маладая матуля стараецца вывозіць дзетак у вёску да сваёй бабулі, якая корміць праўнукаў натуральнымі прадуктамі, балазе, сёлета садавіны і агародніны багата, а чаго вартае казінае малачко з ягадамі!

«Калі з садка прыходзіць маленькая Арынка і яны з Кірылам пачынаюць гуляць, дык хоць ты ўцякай ад шуму! Тады бяром самакат ці ровар і — на вуліцу. Вельмі любім наведваць гарадскі дзіцячы парк альбо забаўляльны цэнтр, дзе малыя даюць волю эмоцыям і гарэзяць там. Пры такіх цэнтрах ёсць няні, яны могуць прыгледзець за дзецьмі, а маці гэты час можа прысвяціць сабе, — гаворыць жанчына. — Увогуле жыццё мужа і жонкі, калі з'яўляюцца дзеці, вельмі крута мяняецца. На дзяцей ідзе каля 70 % даходу сям'і. Бацька гатовы купіць малым усё, што яны пажадаюць. А я стараюся ўсё ж такі да пакупак падыходзіць больш рацыянальна. У краме дзецям хочацца ўсяго, аднак спрабую адвесці іх убок, прапанаваць нешта іншае, больш таннае ці карыснае, напрыклад, пайсці на атракцыёны ці пакатацца на поні».

Алена ўспамінае, як з мужам доўга не маглі вызначыцца з імем сваёй дачушкі. Ніводнае не падабалася. Пяць дзён бацькі не рашаліся спыніцца на нейкім адным. І нарэшце згадзіліся з імем Арына. Што датычыцца сыночка, то тут выйшла значна прасцей — імя адразу знайшлося.

Пасля першага вопыту нараджэння наша гераіня з упэўненасцю казала, што заводзіць другое дзіця не збіраецца. І сужэнцы не планавалі папаўнення. Калі праз год і дзесяць месяцаў яна даведалася, што цяжарная, да апошняга не ведала, што рабіць. Увесь час луналі думкі: яшчэ зусім маленькая дачушка на руках. Як спраўляцца, дзе браць грошы, бо спатрэбіцца ўдвая больш? Калі ж

прыйшла на прыём да ўрача і той спытаў, ці збіраецца яна пакідаць малога, адразу вымавіла «так». Цяпер вельмі радая, што ў яе ёсць сынок і дачушка — жанчына не ўяўляе, як магла б жыць без іх. Адзінае, напачатку вельмі баялася, ці ўдасца ёй справіцца з хлопчыкам. Як аказалася, асаблівай розніцы ў доглядзе няма. Тым больш да нараджэння сыночка дачушку ўжо аддала ў садок, стала прасцей. Ужо ведала, якія лекі патрэбныя, якую каляску лепш выбраць, дзе памперсы купляць, як карміць малога і г. д. Наконт колькасці дзяцей яна больш не загадвае — хто ведае, што запланаваў Бог.

А сёмай гадзіне вечара сям'я збіраецца за вячэрай, так маленькія непаседы вучацца правільна паводзіць сябе за сталом, трымаць відэлец, лыжку, пачынаюць адчуваць еднасць з бацькамі, прывучаюцца да сямейных традыцый. Перад тым як рыхтавацца да сну і чысціць зубкі, малыя любяць пасвавольнічаць. Апошнім часам Арына падабаецца танцаваць перад тэлевізарам, брацік таксама не адстае — хоць не выразна, аднак імкнецца паўтараць рухі за сястрычкай. Маці, дарэчы, даўно заўважыла гэтую прыхільнасць у дачкі. «Наведвалі нават харэаграфічную школу для маленькіх, аднак тады, напэўна, было зарана аддаваць, а сёння дачушка ўжо сама папрасіла, каб я адвяла яе на танцы», — гаворыць матуля. Алена мяркуе, што, вядома, трэба як мага раней паспрабаваць дзіця ў розных занятках, але ў выніку яно само павінна вырашыць, чым хоча займацца.

Маладая мама ўпэўнена, што чым раней аддаеш дзіця ў садок, тым лепш. Хутчэй адбываецца адаптацыя. Так было з дачушкай, яна хутчэй навучылася трымаць лыжку, стала сама прасіцца на гаршчок, пачала добра гаварыць. У групе дзіця бачыць, як паводзяць сябе астатнія, і імкнецца не адставаць.

Для ўтаймавання малых маці заводзіць іх у душ — і Арынка, і Кірыл абажаюць прымаць ванну. «Штораз у нядзелю раблю кожнаму з пенай, з цацкамі — ім вельмі падабаецца», — дзеліцца жанчына. А дзясятай дзеці павінны быць у ложку, бо заўтра трэба збірацца ў садок і адной, і другому. Так-так, яна вырашыла і малога прывучаць да садка. Учора на гадзінку-другую пакідала хлопчыка ў групе, сама ж за дзвярыма прыглядала, як той сябе паводзіць. Маладая мама лічыць, што чым раней аддаеш дзіця ў садок, тым лепш. Хутчэй адбываецца адаптацыя. Так было з дачушкай, яна хутчэй навучылася трымаць лыжку, стала сама прасіцца на гаршчок, пачала добра гаварыць. У групе дзіця бачыць, як паводзяць сябе астатнія, і імкнецца не адставаць. Вядома, многія матулі не спяшаюцца аддаваць сюды сваіх гадаванцаў, лічаць, што самі могуць быць і выхавальніцай, і сябрам для малога. Аднак, на думку Алены, гэта не зусім правільна. Матуля не адмаўляе, што часам у яе з'яўляецца адчуванне «вінаватасці» перад сваёй «крывінкай» — за тое, што пакідае дзіця ў садку і не можа быць побач, як звычайна. Аднак гэтае пачуццё хутка знікае.

Я спытала ў яе, што самае цяжкае ў мацярынстве, а што, наадварот, прыносіць неймаверную радасць? Алена адказала, што цяжка, бясспрэчна, падымацца ўначы, калі ў дзіцяці нешта баліць. Нялёгка выдзеліць час для сябе, каб элементарна прыняць душ ці зрабіць маску, і пры гэтым трэба яшчэ сачыць, каб у доме не ўтвараўся вэрхал. «Аднойчы дала дзецям марозіва, думала, хоць крыху сцішацца, аднак калі праз нейкі час зайшла да іх у пакой, гэтае марозіва было ўсюды: на канапе, на дыване, і нават люстэрка было ў ім, — расказвае Алена. — Муж часта ў камандзіроўцы, таму дзеці паўсюль са мной, з імі я — і ў банк, і ў краму, а яшчэ нязручна з каляскай прыстасоўвацца да лесвіц». Радуе жанчыну само адчуванне мацярынства — што пашанцавала стаць мамай разнапалых дзетак.

Яшчэ амаль праз год маладой жанчыне выходзіць на работу — яна працуе тэхнолагам на льнозаводзе — таму пакуль мая гераіня стараецца не прыспешваць час і атрымліваць асалоду ад кожнага дня дэкрэтнага водпуску.

Надзея ЗУЕВА.
Фота з сямейнага архіва герояў.

#яжмаці

ДЗЯВОЧЫЯ ТАЙНЫ,

або Пра вожыка і сакрэты жаночай душы

Міша не адчуваў ніякага інтарэсу да сваёй старэйшай сястры Сашы. Ну, можа, толькі падчас навагодніх святаў, і тое калі ў яе заставаліся няз'едзеныя «прафкамаўскія» прысмакі. Ён выказваў да яе павагу роўна настолькі, наколькі неабходна было для таго, каб дамагчыся ад яе жаданай цукеркі. Усё змянілася ў мінулым годзе, калі яму споўнілася адзінаццаць...

Спачатку ён стаў з цікавасцю назіраць за вечарынамі сястры і яе пятнаццацігадовых сябровак. Звычайна яны замыкаліся ў пакоі, глядзелі фільмы, слухалі музыку і шапталіся. Спачатку, каб прабіцца ў іх кампанію, Мішка навучыўся варыць ім капучына, потым — пекчы для іх круасаны. За гэта яму дазвалялася пасядзець там пару хвілін і трохі паслухаць музыку. Але неўзабаве дзяўчынкі так прывыклі да Мішкі, што нават заказваючы піцу, клікалі яго да сябе. Гэта быў прывілей, бо іншыя сваякі ў выглядзе бацькоў і малодшых сясцёр пра такое нават і не марылі. Вядома, піцай іх маглі пачаставаць, але есці яе можна было дзе заўгодна, толькі не ў іх пакоі.

Гэтым летам Мішку споўнілася дванаццаць. Мы ўсёй сям'ёй адпачывалі ў вёсцы. Часам да нас на некалькі дзён прыязджалі сябры то Мішы, то Сашы. І калі з сябрамі сына было ўсё зразумела: рэчка, плыт і бойкі, то старэйшая дачка імкнулася да адасаблення. А тут якраз хросныя маіх дзяцей з'язджалі ў Мінск на час і пакінулі Сашы з Мішкам ключы ад свайго дому, каб яны прыглядалі за арміяй катоў ды ад меншых сясцёр-братоў маглі адпачыць. Яны былі вельмі радыя, але ўсё ж Аляксандра паставіла ўмову: маўляў, як толькі прыедзе яе сяброўка, Мішка ў хату да родных.

Той не хаваў расчаравання. Каб задобрыць сястру, як на тое, не было кававага апарата, ды і газавай духоўкай, каб спячы круасаны, ён не адважыўся карыстацца, таму проста ўгаворваў яе дазволіць яму застацца. Сашка была непахісная... І вось надышоў дзень «ікс».

Ужо змяркалася, калі на вясковай вуліцы з'явіўся бацькоўскі аўтамабіль з госцяй. Мішка быў пануры, але надзеі не губляў. Ён дагадкаў дзяўчынкам, як мог: насіў ім патрэбныя рэчы, гатаваў гарбату і нават мыў за імі посуд...

Было цёмна, калі дзяўчынкі пайшлі начаваць у суседскі дом. Мішка затрымаўся, але ўсё ж выбег за імі, каб дагнаць. Праз дзесяць хвілін дзяўчынкі паведамілі нам па тэлефоне, што Мішка наступіў на вожыка і раве. Мы з мужам схапілі аптэчку, тэлефоны ды пабеглі да іх у суседні дом. Сын сядзеў заплаканы на ложку, а вакол яго ўвіваліся дзве 16-гадовыя дзяўчыны, відавочна занепакоеныя станам цінэйджара. Я кінулася да яго, муж ужо шукаў у тэлефоне інфу, што рабіць у такіх выпадках.

— Калі вы наступілі на вожыка, то апрацуйце параненае месца дэзінфікуючым сродкам і... тэрмінова купіце акуляры! — чытаў мой муж трывожным голасам услых.

— А акуляры навошта? — спыталі дзяўчынкі хорам.

— Каб вожыкаў лепш бачыць, а то не напасешся на вас вожыкаў у акрузе, — адказаў муж. Дзяўчынкі засмяяліся. Мішка пакрыўджана адвярнуўся.

— Ды і наогул, чаго ты ў цемры босы бегаеш? — строга спытала я сына, апрацоўвачы яму рану.

— Мне так зручна, — буркнуў у адказ сын.

— Ну, Мішка, не хвалюйся ты так, — сказала госця. — Хочаш, заставайся ўжо з намі. Будзем прыглядаць за табой усю ноч.

Мішка з надзеяй паглядзеў на сястру. Сашка ўздыхнула і матнула галавой.

— Ладна, паранены ўсё ж...

Мішка заззяў, закінуў рукі за галаву і адкінуўся на падушку. Я зірнула на сына і зразумела, што ў гэты момант ён усвядоміў яшчэ адну ўласцівасць жанчын: слабасць да скупой мужчынскай слязы.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Праект «СГ»

«Калі не цяпер, то калі?»

Стоячы на кухні, Каця, гаспадыня кватэры, дзе я здымаю пакой, раптам расказала, што нарэшце пачала карыстацца сваімі духамі «Шанэль № 5». Яна захоўвала флакончык з любімым водарам, падораны бацькамі чатыры гады таму. Пасля невялікай паўзы Каця вымавіла: «Калі не цяпер, то калі?»
Гэтая фраза стала зыходнай кропкай у маёй гісторыі. Я адразу падумала, што сёння многія з нас пачынаюць па-іншаму ацэньваць сваё жыццё. Змяняецца яго рытм, змяняецца ранейшая сістэма каштоўнасцяў: тое, што было галоўным напярэдадні і падчас пандэміі, сыходзіць на другі план. І наадварот.
«Калі не цяпер, то калі?» — гэта гісторыі звычайных людзей і іх жаданняў, якія ўдалося здзейсніць насуперак пандэміі COVID-19, а можа, дзякуючы ёй.
Яны ведаюць адно — іх жыццё не будзе ранейшым.

Таццяна УЛАСЕНКА, 39 гадоў, журналіст, Мінск:

— Я заўсёды марыла быць стылістам. Хацела навучыцца краіць і шыць, каб разумець працэс знутры і самой ствараць вопратку. Сіндром «адкладзенага жыцця» расцягнуў гэтую мару на доўгія гады. Але смажаны певень у выглядзе COVID-19 усё ж клюнуў! Больш за тое, менавіта ён дапамог маёй мары рэалізавацца. Трапіць на базавы курс шыцця з-за яго шалёнай папулярнасці было немагчыма. Месцы ў групе распісаныя на некалькі месяцаў наперад, і ў мяне проста апускаліся рукі. Але адно месца раптам аказалася вольным. Вельмі хутка я навучылася краіць і шыць трыкатажныя вырабы. Пашыла сукенку ў гарохі і гольф-туніку.

Страхаў у сувязі з эпідэміяй не адчуваю. Я — фаталіст. Дома, з мужам, больш жартуем на гэты конт. Калі нешта і здарыцца, то трэба прыняць гэта як ёсць. Больш хвалюемся за старэйшае пакаленне. Пасля пандэміі ўсё пустое, фэйкавае на нейкі час адыдзе на задні план. Але ў глабальным сэнсе ні людзі, ні іх звычкі не зменяцца. Стануць часцей мыць рукі? Гэта яшчэ пытанне! Як паказвае практыка, чалавецтва не вучыцца на ўласных памылках. З пазітыўнага — калі адкрыюцца межы, прагназую постэпідэмічны бум турызму.

Дар'я АЛЬПЕРН-КАТКОЎСКАЯ, 37 гадоў, псіхолаг, Эйлат (Ізраіль):

— Я вырашыла зрабіць новую стрыжку, абнуліцца, паэксперыментаваць. Калісці даўно я працавала юрыстам у буйной юрыдычнай кампаніі. Там быў звод правілаў, якія дэталёва рэгламентуюць знешнасць супрацоўніка. Я памятаю, як мяне гэта бянтэжыла і абмяжоўвала. Потым жыццё мянялася, я мяняла стрыжкі, але ўсе валасы ніколі не састрыгала. Калі аказаліся на каранціне, муж пастрыг мяне. Высветлілася, што ў мяне прыгожая форма галавы, а яшчэ да яе вельмі прыемна дакранацца.

Калі цяпер я фантазіраваю пра канец пандэміі і каранціну, мне ўяўляецца нешта падобнае да заканчэння вайны: маніфест жыцця нягледзячы на эканамічны заняпад. Прыгожыя жанчыны ў сукенках, прагулкі, паездкі, сустрэчы і абдымкі з сябрамі і блізкімі, пэўныя рытуалы і дзеянні, каб зноўку выбудаваць наш рэальны афлайнавы свет.

Вольга НІЖНІКАВА, 31 год, урач-радыёлаг, Грац (Аўстрыя):

— Калі быў уведзены каранцін, і я перайшла на працу ў хатніх умовах, першае, пра што падумала: «Як жа я выжыву без кавамашыны?» Я заўсёды любіла каву з малочнай пенкай, але ў Аўстрыі пачала піць каву нашмат часцей. Так што першым набыткам стала кавамашына. Аб тым, каб набыць яе, задумвалася даўно, з таго часу, як адзін знаёмы барыста паказаў, што значыць сапраўды смачная кава. Але ўвесь час гэтая мара адкладвалася на нейкі нявызначаны час. Аднак пры аб'яўленні хатняга рэжыму ў красавіку вырашыла, што час надышоў.

Падчас пандэміі ў Аўстрыі быў уведзены каранцінны рэжым. Забаранілі ўсе грамадскія мерапрыемствы. Адным з першых адмененых мерапрыемстваў быў Еўрапейскі кангрэс радыёлагаў, на якім я павінна была прадставіць два даклады.

Думаю, што пандэмія зменіць у нас успрыманне асабістых межаў і разуменне асабістай гігіены. Прынамсі, спадзяюся на гэта.

Святлана ХМЯЛЬНІЦКАЯ, 33 гады, рэдактар сайта, Мінск:

— Я не ўмею маляваць. Але мне падабаюцца карціны як каляровыя плямы на сценах. І я жудасна зайздрошчу дзяўчынкам, якія вучацца ў каледжы мастацтваў. Яшчэ ў студзені на драйве зайздрасці я купіла палотны на падрамніку і фарбы. Вельмі доўга, амаль тры месяцы, выбірала, якія карцінкі з інтэрнэту я намалюю. Падчас добраахвотнага паўкаранціну я, нарэшце, намалявала копію копіі адной карціны. Выглядае трохі дзікавата, нязграбна і па-дзіцячы, але я задаволеная. Не ведаю, чаму не рабіла гэтага раней, а цяпер зрабіла. Напэўна, таму што стала больш сядзець дома, і выгляд белых палотнаў пачаў мяне раздражняць. Потым зразумела, што мяне раздражняюць не белыя палотны, а мая нерашучасць. Я саромелася нават самога намеру. А калі ў Інстаграме ўбачыла подпіс «Мне ўсё можна», падумала: «Блін, я таксама хачу, каб мне ўсё было можна». Села і ўсё размалявала, як мне хацелася. А калі б не гэты добраахвотны паўкаранцін, то, думаю, палотны так і стаялі б яшчэ год.

Спадзяюся, калі скончыцца пандэмія, ва ўсіх прадуктовых крамах застануцца каляровыя палоскі на падлогах каля касы, каб людзі паменш дыхалі адно аднаму ў спіны і не піхалі адно аднаго сваімі напоўненымі кошыкамі.

Альгерд БАХАРЭВІЧ, 45 гадоў, пісьменнік, Мінск:

— Гэты год абяцаў быць выдатным: кніжныя кірмашы ў Лейпцыгу і Эдынбургу, прэм'ера спэктакля ў Лондане, прэзентацыя англійскага перакладу майго рамана «Дзеці Аліндаркі»... Замест гэтага я сяджу дома і пяку хлеб. 13 сакавіка мая жонка, паэтка і перакладчыца Юля Цімафеева, вырашыла, што каранцін непазбежны, і я з ёй пагадзіўся. Я пішу кнігі, мая прафесія звязана з тэкстамі, таму ўжо шмат гадоў працую дома, у гэтым сэнсе наша жыццё змянілася не так моцна, як у іншых. Але, думаю, калі б не гэтая добраахвотная самаізаляцыя, да хлеба ў мяне б рукі так і не дайшлі. Хоць я даўно ўжо марыў навучыцца яго пячы, але мяне заўсёды палохала складанасць і сакральнасць гэтага працэсу, таемнае жыццё цеста і ўсялякія стэрэатыпы. Так што дзякуй каранціну за гэты час — на восьмы дзень я нарэшце адважыўся: спёк свой першы хлеб, з часнаком і зелянінаю. Атрымалася вельмі смачна, хоць і па-дылетанцку. А цяпер я ўжо пяку прыгожы хлеб у маім любімым міжземнаморскім стылі, дзялюся яго фотаздымкамі ў «Фэйсбуку» і ніяк не магу спыніцца.

Не ведаю, што будзе з гэтым светам і намі, але хлеб я збіраюся пячы і далей. Гэтая пандэмія па людзях маёй прафсэіі б'е даволі моцна (яна па ўсіх б'е), людзі цяпер больш перачытваюць любімыя кнігі, чым чытаюць новае. Калі так пойдзе і далей, буду вучыцца на пекара. А потым адкрыю сваю пякарню.

Анастасія ХАПАНЕН, 38 гадоў, гештальт-тэрапеўт, Мінск:

— Каб знізіць сваю трывожнасць у сувязі з «ковідам», прыняла рашэнне зменшыць колькасць кантактаў, практычна самаізалявалася дома, стала працаваць з кліентамі анлайн, часцей мыць рукі, выходзіць на вуліцу толькі ў краму ці пагуляць з сабакам. Мне не хапала актыўнасці, руху. І я прыдумала, як сябе падтрымаць — паставіла для сябе маленькую мэту, дасягнуць якую было ў маіх сілах. Я вырашыла... сесці на шпагат. У дзяцінстве захаплялася акрабатыкай, але з часам гнуткасць у целе знікла. Раніцай я пачала займацца ёгай, а пасля рабіла расцяжку. Паступова ў целе стала адчувацца больш лёгкасці. Прыйшоў спакой і задавальненне.

Быў страх страціць родных і блізкіх, асабліва маму, якой 69 гадоў. Тэлефанавала ёй кожны дзень і прасіла не выходзіць з дому без патрэбы, надзяваць маску.

Думаю, што многія людзі перагледзелі свае каштоўнасці і зразумелі, што для іх сапраўды важна. Асабіста яшчэ раз усвядоміла, як мне патрэбна свабода, блізкія людзі, і як выдатна, што я жыву на гэтым свеце.

Таццяна ТКАЧОВА.

ГАТОВЫЯ ДАПАМАГАЦЬ

Больш за 600 дзяцей і падлеткаў з сем'яў Гомельскай вобласці, якім патрабуецца дапамога, атрымалі школьныя прыналежнасці і падарункі, сабраныя падчас акцыі «Збяром дзяцей у школу», арганізаванай Беларускім таварыствам Чырвонага Крыжа. У самім Гомелі падарункі атрымалі і 10 дзяцей бежанцаў і перасяленцаў з Украіны.

— Наша арганізацыя штогод праводзіць гэтую дабрачынную акцыю, — гаворыць **першы намеснік Генеральнага сакратара Беларускага Таварыства Чырвонага Крыжа Іна ЛЕМЯШЭЎСКАЯ.** — Яе задача — падтрымаць пэўныя катэгорыі грамадзян Беларусі, таксама і бежанцаў, якія пражываюць на тэрыторыі нашай краіны. На просьбу дапамагчы дзецям сабрацца да вучобы актыўна адгукаюцца шмат людзей па ўсёй краіне.

Так, па выніках мінулага года па ўсёй краіне дапамогу да пачатку навучальнага года ад арганізацыі атрымалі больш за сем тысяч сем'яў, у тым ліку каля 400 дзяцей з сем'яў бежанцаў. Вынікі гэтага года падвядуць крыху пазней: мерапрыемствы, падчас якіх урачаюць неабходныя для вучобы прадметы, яшчэ працягваюцца. Іна Лемяшэўская дадала, што бежанцам аказваюць і іншыя віды падтрымкі: фінансавую, экстраную дапамогу ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, аплату медыцынскіх паслуг, садзейнічанне ў пошуку працы, кансультаванне па розных пытаннях і іншае. На акцыі ў Гомелі падарункі ад БТЧК атрымалі трэцякласнікі Таісія і Данііл Шылавы. З 2015 года іх сям'я з Украіны жыве ў Гомелі. Яны прыехалі ў Беларусь лячыць дачку Таісію. З-за сітуацыі, якая склалася ў Данецку, не было магчымасці дапамагчы дзяўчынцы там. Таксама дзякуючы падтрымцы арганізацыі, у тым ліку фінансавай, сям'я адкрыла капіравальны цэнтр у Гомелі. У 2018 годзе ім удалося атрымаць від на жыхарства. Сёння сям'я працягвае жыць у Беларусі і працаваць на карысць другой Радзімы.

Акцыя «Збяром дзяцей у школу» будзе доўжыцца да 14 верасня.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Агро-сад Рассвет»

Предметы торгов	Начальная цена, руб. (без учета НДС)	Размер задатка, руб.
Лот № 1: Трактор «БЕЛАРУС» 922.3, категория – «А», год выпуска – 2009, регистрационный знак АВ-1 2584	9 400,00	940,00
Лот № 2: Трактор «БЕЛАРУС» 922.3, категория – «А», год выпуска – 2009, регистрационный знак АВ-1 2358	9 400,00	940,00

Продавец: ОАО «Агро-сад Рассвет», 225031, Брестская обл., Брестский р-н, аг. Вистычи, ул. Центральная, 22. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». **Р/с для перечисления задатка:** р/с BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция № 100 по Брестской области, г. Брест, ул. Мицкевича, 10, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245. **Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона. **Условия оплаты:** в соответствии с заключенным договором купли-продажи. **Условия продажи:** без условий. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также вознаграждение Организатору аукциона

Аукцион состоится 21 сентября 2020 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, а также иную информацию можно узнать у организатора аукциона по телефонам: 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00

Последний день приема заявлений – 21 сентября 2020 г. до 10.00

Ранее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 06.08.2020

СУМЯСЦІЦЬ КАРЫСНАЕ З ПРЫЕМНЫМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

— Дзмітрый Зіноўевіч, можа быць, сёння «службовых раманаў» стала менш? Бо зараз наладжваць асабістае жыццё ў асноўным прынята з дапамогай сайтаў знаёмстваў...

— Менш іх не стала. І не стане. Пакуль людзі будуць хадзіць на работу і праводзіць там большую частку жыцця, службовыя раманы будуць невынішчальнымі. Калі разважаць пра «анатомію» сексуальнага прыцягнення, пачынаць трэба з самага пачатку гісторыі канкрэтнага чалавека — з яго ўнутрыўтробнага развіцця. Першым з пачуццяў у плода закладваецца нюх, які ў далейшым будзе іграць адну з асноўных роляў у выбары партнёра. Менавіта нюх першым падсвядома падказвае, «наш» або «не наш» гэта чалавек, выклікае ён жаданне або адвяржэнне. Так мы ўстроеныя. Таму асабістыя сустрэчы не могуць паразвацца са знаёмствамі ў сетцы. Дарэчы, прафесійныя якасці, а дакладней, задаткі кіраўніка, мы таксама атрымліваем яшчэ ва ўнутрыўтробны перыяд развіцця. І яны напрамую звязаныя з сексуальнасцю. З чацвёртага па сёмы тыдзень цяжарнасці ў плода фарміруюцца тыя аддзелы галаўнога мозга, якія адказваюць за ўсведамленне свайго полу, за сексуальныя паводзіны і выбар сексуальнага партнёра ў далейшым. А пол дзіцяці закладваецца раней. Калі ў арганізме маці, што выношвае дзяўчынку, адбыўся рэзкі выкід мужчынскіх палавых гармонаў, мозг дзіцяці фарміруецца па мужчынскім тыпе. Так, уявіце сабе, наш мозг мае пол. Чаму можа адбыцца такі выкід гармонаў у цяжарнай жанчыны, пакуль незразумела — магчыма, гэта стрэс, асаблівасці харчавання будучай маці ці стан экалогіі... Верагодна, што па меры сталення ў дзяўчынкі могуць з'явіцца гомасексуальныя схільнасці. Сур'ёзны збой гарманальнага фону маці хлопчыка ў гэты ж перыяд выношвання дзіцяці дае той жа вынік — гомасексуальнасць. Ну, а невялікі выкід мужчынскіх палавых гармонаў паміж чацвёртым і сёмым тыднямі цяжарнасці ў арганізме жанчыны, якая выношвае дзяўчынку, забяспечвае нованароджанай «мужчынскі характар». У далейшым гэта актыўная жанчына з мужчынскім стылем паводзінаў і ярка выяўленымі лідарскімі якасцямі — тая самая «самадастатковая і незалежная». Гэтак жа, як перакос у бок жаночых палавых гармонаў у той жа перыяд у арганізме маці хлопчыка «падорыць» у далейшым мужчыне мяккасць, нерашучасць, імкненне сысці ад канфлікту — тып Навасельцава з кінафільма «Службовы раман». Але гэта — тое, што «дадзена», першапачатковыя «ўмовы задачы». Ролю выхавання ў фарміраванні характару чалавека нельга прымяншаць.

ЁН — НАЧАЛЬНІК, ЯНА — ПАДНАЧАЛЕНАЯ

— Лічыцца, што адносіны «дырэктар — сакратарка» заўсёды непаўнавартасныя: яна закаханая, а з яго боку гэта проста сувязь...

— Вельмі часта гэта сапраўды так. Закладзеная прыродай задача мужчыны — перадаць як мага больш сваіх генаў, пакінуць як мага больш нашчадкаў і такім чынам працягнуць сябе ў будучыні. Калі казаць пра варыянт «начальнік — падпарадкаваная», то вельмі часта, на жаль, з яго боку моцныя пачуцці адсутнічаюць. А вось жанчына ў такой мадэлі адносін, падпарадкоўваючыся закладзеным у ёй задачам, наадварот, звычайна мае моцныя пачуцці да начальніка. Аснова нармальнай жаночай сексуальнасці — прынцып «мужчына зверху»: выбраннік павінен быць у чымсьці вышэй за яе. Напрыклад, знаходзіцца на больш высокай прыступцы сацыяльнай лесвіцы. Чым больш статусны мужчына, тым большую цікавасць ён выклікае ў жанчын. Калі на сімпатычную дзяўчыну — маладога спецыяліста звярнуў увагу кіраўнік кампаніі (асабліва калі ён яшчэ не стары, імпазантны і дагледжаны), шанцаў у яго будзе значна больш, чым у калегі-аднакурсніка. І з пункту гледжання нармальнай сексуальнасці гэта правільна: прырода заклала ў жанчыну патрэбу падпарадкоўвацца.

«Калі мужчына разгадаў гэты рэбус і знайшоў «унікальную прапанову» для сваёй жанчыны, ён стане для яе незаменным і адзіным, і зможа не баяцца канкурэнцыі нават з боку тых, хто прапануе ёй «залатыя горы».

— Грамадствам нярэдка асуджаецца падобны выбар жанчыны. Гэта асуджэнне неправамернае?

— Так. Па крайняй меры, з пункту гледжання сексалогіі. Жанчына, якая імкнецца перавесці адносіны з шэфам з дзелавой сферы ў рамантычную, проста адпрацоўвае жаночую біялагічную праграму. Яна імкнецца атрымаць абарону — тое, што апрыёры павінна атрымліваць жанчына ад мужчыны. У дадзеным выпадку яе абараняюць яго статус і яго матэрыяльнае становішча. Калі адкінуць мараль і казаць аб нашых біялагічных праграмах, то галоўны «тавар» жанчыны — гэта яе маладосць. Чым яна маладзейшая, тым больш яна канкурэнтаздольная на рынку адносін. Падсвядомасць пастаянна нагадвае ёй: часу з кожным днём застаецца ўсё менш, трэба паспець забрацца вышэй. Разумеючы гэты механізм, складана асуджаць жанчын, якія аддаюць перавагу начальніку і гатовыя прамяняць на яго свайго менш статуснага мужа — «сярэднестатыстычнага», з сярэднім заробкам. Так, ён не п'е, ён добры бацька іх агульным дзецям, ён здабытчык: у выхадныя ездзіць на рыбалку і прывозіць дадому «трафеі» — свежазлоўленую рыбу, якую жанчына павінна чысціць і смажыць. А дырэктар прапануе ёй у абмен на яе згоду два тыдні на Сейшэлах. Ці многія паедуць з начальнікам? І які працэнт жанчын застанецца дома чысціць рыбу? Некага, вядома, спыніць магчымая рызыка: і тут усё страціш, і там нічога не складзецца.

— А ці магчымы варыянт, калі са сваім «сярэднестатыстычным» мужам у працівагу статуснаму мужчыне жанчына застаецца не з-за страху рызыкнуць?

— Магчымы. Гэта і ёсць праверка адносін. Дакладней, праверка адносін мужчыны да сваёй жанчыны — таго мужчыны, які з вудай. Калі ў яго ёсць для сваёй выбранніцы, як сёння кажуць у бізнесе, «унікальная прапанова» — жанчына застанецца з ім пры любым раскладзе. Што гэта за «ўнікальная прапанова», мужчына павінен зразумець, выходзячы з таго, чаго не хапае яго выбранніцы. Грошы, прыгожае жыццё? Гэта ляжыць на паверхні, але гэта — адказ няправільны. Сама па сабе «дольчэ віта» не робіць чалавека шчаслівым, так толькі здаецца. Так, фінансавая незалежнасць дае чалавеку больш магчымасцяў дасягнуць шчасця, але гэта тэма для іншай размовы. На самай справе кожнаму чалавеку для шчасця трэба нешта сваё. Калі мужчына разгадаў гэты рэбус і знайшоў «унікальную прапанову» для сваёй жанчыны, ён стане для яе незаменным і адзіным, і зможа не баяцца канкурэнцыі нават з боку тых, хто прапануе ёй «залатыя горы». Яго жанчына нікуды не сыдзе. Хоць думка «а можа, усё ж рызыкнуць і паспрабаваць забрацца вышэй?» час ад часу будзе яе наведваць — і гэта нармальна.

ЯНА — НАЧАЛЬНІК, ЁН — ПАДНАЧАЛЕНЫ

— Давайце пагаворым пра адваротны варыянт. Прынята лічыць, што жанчына-дырэктар выбірае сабе мужчыну маладзей і (або) ніжэй па статусе: Людміла Пракоф'еўна і Навасельцаў...

— Такі варыянт магчымы, але не так распаўсюджаны, як лічаць стваральнікі кінасцэнарыяў і аўтары жаночых раманаў. Часам сапраўды жанчына-начальнік выбірае чалавека маладзейшага за сябе і ніжэйшага па статусе. Але дэфармацыі адносін у бок сцэнарыя «мама і сын» у такой пары не будзе. Жанчына-начальнік успрымае свет хутчэй як мужчына і адносіцца да палюбоўніка ў гэтым выпадку будзе як статусны мужчына да палюбоўніцы-сакратаркі. Часам за такіх мужчын жанчына-«амазонка» нават можа выйсці замуж, каб нарадзіць дзіця ў шлюбе. Але ў любым выпадку гэта не раман, а выкарыстанне службовага становішча ў асабістых мэтах. Статусную жанчыну можа зацікавіць чалавек, які сёння ніжэй, чым яна, на прыступках кар'ернай лесвіцы, але ў кім яна бачыць сур'ёзны патэнцыял росту і перакананая, што праз некалькі гадоў ён зможа яе абагнаць. У гэтым выпадку адносіны з жанчынай-начальнікам — свайго роду «ордэн» для мужчыны. За такога мужчыну статусная жанчына таксама можа выйсці замуж і будзе расчараваная, калі ён не зробіць бліскучую кар'еру. Калі кар'ера выбранніка не складзецца, то распадзецца і сям'я.

— Жанчына на кіруючых ролях — гэта абавязкова жанчына з мужчынскім складам характару?

— Справа ў тым, што жанчына не зможа быць начальнікам без трансфармацыі палавой ролі. Яна арганізуўвае працу, некага прымушае, карае, «ставіць на месца». Яна выконвае функцыю абароны: абароны справы свайго жыцця. А абараняць — гэта мужчынская функцыя. Чым вышэй жанчына падымаецца па службовай лесвіцы, тым у большай ступені ёй даводзіцца губляць жаночыя якасці — мяккасць, супераджыванне, клапатлівасць. І набываць мужчынскія якасці: настроенасць на барацьбу, уменне «ісці да канца». Паступова ў яе выпрацоўваюцца мужчынскія каштоўнасці — кар'ера для яе важнейшая за сям'ю. Трэба сказаць, што да такіх жанчын цягнуцца мужчыны, нярэдка «амазонкі» стыльна выглядаюць — фінансавыя магчымасці ім гэта дазваляюць. Але ў іх бываюць праблемы з аслабленай сексуальнай цягай, калі толькі яны не трапляюць у лік уладальніц моцнай палавой канстытуцыі. Як правіла, да 30—40 гадоў у такой «амазонкі» альбо няма сям'і і дзяцей, альбо ёсць муж і адно дзіця, таму што «так трэба».

— Які мужчына здольны сапраўды зацікавіць жанчыну-начальніка?

— Галоўная эрагенная зона такіх жанчын — інтэлект. І зацікавіць статусную жанчыну можа мужчына-сапернік. У такой жанчыны палюбоўнікі часцей за ўсё — з яе асяроддзя, гэта людзі яе ўзроўню, якія даказалі, што яны таксама нешта з сябе ўяўляюць. Мужчыны-падначаленыя — нават разумныя, прыгожыя, прафесійныя і таленавітыя — усё ж «пад ёй», і, значыць, нецікавыя. Раманы «начальніца — падначалены» — не больш чым мужчынская фантазія, у рэальнасці яны здараюцца не часта. Каб гэта адбылося, мужчына павінен паставіць сабе мэту закахаць у сябе начальніцу і не пашкадаваць намаганняў, даказваючы, што ёсць сфера, дзе ён больш кампетэнтны, чым яна.

— Ці могуць два лідара скласці шчаслівы саюз? Або жанчына-начальнік асуджаная на адзіноту?

— Патэнцыяльныя партнёры для жанчыны-начальніка, як я ўжо казаў, — мужчыны больш статусныя або яе ўзроўню. Але праблема ў тым, што асноўны «рухавік» у жыцці для такой жанчыны — барацьба. І яна, хутчэй за ўсё, не зможа адмовіцца ад жадання перамагчы свайго мужчыну: падняцца на яго ўзровень, а потым — вышэй. Калі гэта адбудзецца, мужчына стане ёй нецікавы. Толькі ў самых разумных жанчын склад «амазонка» можа з'явіцца думка: навошта ператвараць раман у пастаянную барацьбу? Але, як паказвае практыка, падобныя думкі ўзнікаюць, калі ратаваць адносіны ўжо позна.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29

Предмет аукциона

Лот № 1 – Банк (здание специализированное финансового назначения), общ. пл. **2379,7 кв. м**, инв. № **400/С-3725**, по адресу: **г. Гродно, ул. Мицкевича, 3.** Составные части и принадлежности: подвал ((А4/к)), навес (а). Начальная цена с НДС 20 % – **3 943 572,36 бел. руб.**
Обременение: договор аренды. Подробная информация на сайте WWW.CPO.BY
Сведения о земельном участке: предоставлен на праве постоянного пользования общей площадью 0,1086 га для обслуживания административного здания (головной филиал по Гродненской области).
Дополнительная информация. При приобретении предмета аукциона, победитель аукциона или единственный участник аукциона заключает с Продавцом договор купли-продажи имущества, относящегося к предмету аукциона **на сумму 52 983,76 бел. руб. с НДС 20 %.** Состав имущества и цены размещены на сайте организатора торгов www.cpo.by

Дата и время проведения аукциона по лоту № 1: 05.10.2020 в 15.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки». Дата и время окончания приема документов: 01.10.2020** до 17.00 по указанному адресу

Лот № 2 – Склад (складское помещение), общ. пл. **227,4 кв. м**, инв. № **500/D-1003747**, по адресу: **г. Минск, ул. Могилёвская, д. 5-2. Начальная цена с НДС 20 % – 135 095,69 бел. руб.**

Дата и время проведения аукциона по лоту № 2: 07.10.2020 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки». **Дата и время окончания приема документов: 05.10.2020** до 17.00 по указанному адресу

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок заключения договора купли-продажи: 20 календарных дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона: победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 % (далее – единственный участник аукциона), обязан произвести оплату в размере 100 % стоимости имущества не позднее **30** календарных дней с момента заключения договора купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by.
Передача предмета аукциона победителю аукциона (единственному участнику аукциона), заключившему договор купли-продажи, производится по акту приема-передачи в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента полной оплаты стоимости недвижимого имущества.
Победителю аукциона (единственному участнику аукциона), обратиться за государственной регистрацией перехода права собственности на недвижимое имущество после передачи ему имущества в установленном порядке.
Расходы, связанные с организацией и проведением торгов, заключением (удостоверением) договора купли-продажи, в том числе оплатой государственной пошлины, государственной регистрацией договора и перехода права собственности на недвижимое имущество, а также с удостоверением сделки, включая оплату государственной пошлины, несет победитель аукциона (единственный участник аукциона), заключивший договор купли-продажи

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение по лоту № 1 опубликовано в газете «Звязда» от 18.08.2020 г., по лоту № 2 в газете «Звязда» от 12.08.2020 г.

Контактные телефоны	+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42 E-mail: auction@cpo.by

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: 8 (017) 298-53-53; 8 (029) 690 54 09, BELTORGI.BY

Продавец: **ООО «Инструментспецсервис»** (УНП 190749513) 247632, ул. Пушинских, 31а-25, 220112, г. Минск, в лице ликвидатора Гадлевской Елены Витальевны.

Публичные торги в электронной форме будут проведены: **12 октября 2020 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

Предмет торгов – фрезерная оснастка в ассортименте (фреза насадная 160х45/40з 4.0 хв, 4 шт., фреза отрезная 150х3,2/2,2/35з = 36, 1 шт., фреза отрезная 150х3,2/2,2/40з = 36, 4 шт., фреза 125х15/30, 2 шт., фреза отрезная 150х5/3,5/32з = 24, 1 шт., фреза 125х22/30, 2 шт., фреза 140х35/40, 1 шт., фреза отрезная 245х4,5/3,5/32з = 60, 2 шт., фреза насадная 180х40/40з 8.0 хвл, 1 шт., фреза насадная 180х40/40з 8.0 хвп, 1 шт., фреза насадная 140х15/35з 4.0 хвп р=10, 2 шт., нож профиль 100х20/30з 3.0 хвл, 3 шт., нож заточенный 3110 160х8/32з 6.0 хс, 3 шт., нож заточенный 3110 160х12/32з 6.0 хс, 1 шт., головка фрезерная 136х30/40 з=4, 1 шт., головка фрезерная 147,5х50/40 з=4 хв1, 1 шт., головка фрезерная 125х13/30 набор, 1 шт., головка фрезерная 143х30/40 з=4, 1 шт., головка профильная 156х26,5/60з хвп, 1 шт., пластина 160х3.8х70, 1 шт.). Начальная цена предмета торгов – 3 224,40 бел. руб. с НДС. Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Местонахождение – г. Минск, ул. Логойский тракт, 25/1-61. Телефон для ознакомления и осмотра +375 29 698-53-18.

Для участия в торгах необходимо в срок с 11.09.2020 г. 09.00 по 09.10.2020 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, уплатить аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ОАО «БЕЛГАЗСТРОЙ» – управляющая компания холдинга» (Продавец)

Лот № 1, состав: 1. Столярный цех, инв. № 602/С-22091, 432,8 кв. м, г. п. – 1989, адрес: Минская обл., Пуховичский р-н, г. п. Правдинский, ул. Зелёная, 53А/8.

2. Материальный склад, инв. № 602/С-22093, 335,4 кв. м, г. п. – 1967, адрес: Минская обл., Пуховичский р-н, г.п. Правдинский, ул. Зелёная, 53А/7.

3. Склад для хранения мелкосортного металла, инв. № 602/С-46875, 109,4 кв. м, г. п. – 1979, адрес: Минская обл., Пуховичский р-н, г. п. Правдинский. Обременения: аренда.

Начальная цена, бел. руб. с НДС – 20 140,00.

Аукцион состоится 29.09.2020 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4. Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Организатора аукциона **ino.by**.

☎ Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «1-я Минская птицефабрика» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже:

Лот № 1: здания пилорамы (инв. № 250019) с инв. № 600/С-158817 общей площадью 1088,4 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 623681300001000563 площадью 0,1229 га (право постоянного пользования) по адресу: Минский район, Горанский с/с, 33, район аг. Чачково.

Земельный участок имеет ограничения в использовании: водоохранная зона ручья 6 пл. 0,1229 га.

Начальная цена объекта с НДС (20 %) – 87 840,00 бел. руб. *Цена снижена на 40 %.* Задаток 10 % от начальной цены **(8 784,00 бел. руб.).**

Лот № 2: здания телятника с инв. № 600/С-155696 общей площадью 1 269,3 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 623681300001000639 площадью 0,5013 га (право постоянного пользования) по адресу: Минский район, Горанский с/с, 35, район д. Лисовщина.

Объект обременен договором аренды, сведения о котором можно получить у организатора аукциона.

Земельный участок имеет ограничения в использовании: водоохранная зона ручья пл. 0,5013 га.

Начальная цена объекта с НДС (20 %) – 145 440,00 бел. руб. *Цена снижена на 40 %.* Задаток 10 % от начальной цены **(14 544,00 бел. руб.).**

Задатки перечисляется на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере, включающем затраты на организацию и проведение аукциона: по лоту № 1 – 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, по лоту № 2 – 3 (трех) процентов. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 18.04.2020, 31.03.2020 и 27.06.2020 соответственно. Аукцион состоится **24.09.2020** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **23.09.2020** до **16.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 516-80-65, 517-80-64, (8029) 102-21-17. УНН 600068728

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 02 октября 2020 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ЗАО «ВИЛИЯ»

Предмет торгов
Капитальное строение с инвентарным номером в ЕГРНИ 500/С-19065 общей площадью 844,5 кв. м (наименование: здание фотоателье (литер А 2/к); назначение: здание многофункциональное)
Сведения о земельном участке: площадь – 0,1071 га, кадастровый номер – 500000000009001218
Местонахождение: г. Минск, ул. Волгоградская, 11
Начальная цена: 1 770 214,16 бел. руб. с учетом НДС
Сумма задатка: 177 021,41 бел. руб.
Обременение: аренда

Продавец имущества: закрытое акционерное общество «ВИЛИЯ», ул. Фабричная, 22-9, 220033, г. Минск.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

